КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №3 (131)
◂ 30 СТУДЗЕНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



**КУДЫ ЛЯЦЯЦЬ ВАЛЬКІРЫІ**

Стар. 12

**РЭЦЭПТЫ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ: ДРАБОК СВАБОДЫ І КОЎШ АБЯЦАННЯЎ**

Купіў не купіў, а патаргавацца можна

Стар. 4

**НЕ — СМЯРОТНАМУ ПАКАРАННЮ**

У Беларусі пачалася кампанія «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання», мэта якой — спыненне прымянення гэтага віду пакарання і далучэнне краіны да агульнаеўрапейскіх каштоўнасцей.

Стар. 6

**ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ПЛЫНЬ**

Дэфіцыт праўды, падзел грамадства, у тым ліку творцаў, на «нашых» і «не нашых» — адно з наступстваў панавання савецкага таталітарнага рэжыму...

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**«Абывацель у варунках крызісу»**

Хто і ад чаго мусіць адмовіцца. Праблему даследуе Вольга Хвоін

▸ З НАГОДЫ

# КАЛІ ВАРТА АДЗНАЧАЦЬ ДЗЕНЬ БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНЦТВА?

Аляксей ХАДЫКА

**Чытаю ў «Звяздзе» пра традыцыі расійскага студэнцкага Таццянінага дня. А на сайце «Хартыі–97» пра тое, як у нядзелю 25 студзеня віцебскія міліцыянты перашкодзілі моладзеваму святу, наладжанаму актывістамі «Нашага дому».**



Таццянін дзень, які цягам апошніх год спрабуюць адзначаць як дзень студэнцтва і ў Беларусі, у гэтай якасці выклікае ў мяне супярэчлівыя пачуцці.

Сапраўды, у 1755 годзе ў Маскве быў заснаваны універсітэт. І што з гэтага? Колькасць студэнтаў у найстарэйшай расійскай навучальнай установе дасягнула 1000 толькі праз 100 год, у 1855-м. Для параўнання, першы беларускі універсітэт быў заснаваны ў Вільні ў 1579 годзе. Ужо ў часы гвалтоўнага яднання з Расіяй ён быў самым буйным у Еўропе, пераўзыходзіў па колькасці студэнтаў Оксфардскі універсітэт (1823) і налічваў у 1830-м, за два гады да свайго закрыцця (з ласкі вялікага асветніка беларусаў цара Мікалая І «Палкавіча»), 1321 навучэнца.

Руіна вышэйшай школы Беларусі — вынік знаходжання нашай краіны ў складзе Расійскай імперыі. Насуперак таму, што ўзровень адукаванасці (як першаснай, так і гімназічна-універсітэцкай) у Беларусі заўсёды перавышаў расійскі, ужо і ў савецкія часы братнюю Беларусь «трымалі» на 5-м месцы па колькасці студэнтаў сярод краін СССР. Пасля Расіі, Літвы, Латвіі і Арменіі. У 1981 годзе на тысячу жыхароў у Расіі прыходзілася 24,5 студэнта, у Беларусі — 17,7. Значная статыстычная перавага Расіі тлумачыцца проста — там вучылі не толькі для сябе. Там рыхтавалі кіраўнічыя і адпаведнага кшталту навуковыя кадры для савецкіх калоній-рэспублік.

У мяне да Маскоўскага універсітэта, які ў абмаляванай палітыцы быў таксама важным шрубком, асабістае стаўленне. Бо я скончыў гэту ўстанову, навучаўся на аддзяленні гісторыі мастацтваў у 1980–1986 гадах. Можа камусьці падасца цікавым, але найлепшыя, самыя вядомыя выкладчыкі там былі паходжаннем... з Беларусі! Памерлы 2 гады таму Віктар Мікалаевіч Грашчанкаў, неперaўзыдзены знаўца італьянскага адраджэння і кіраўнік кафедры замежнага мастацтва — сын Мікалая Іванавіча Грашчанкава з Мсціслаўшчыны, нейрафізіёлага і акадэміка АМН СССР. Лепшы мастацтвазнаўца-візантыніст былога СССР, выключны знаўца іканапісу Вольга Сігізмундаўна Папова з роду Ізмайловічаў-Рамаaccount (маёнтак Чарэвічы на Ушаччыне) прасіла мяне ў 2007 годзе, між іншым, навесці даведкі — што засталося ад сямейнага гнязда. Можа хто ведае? А Аляксей Растаргуеў, адносна малады спецыяліст, які быў апанентам на абароне майго дыплома («Мастацкая калекцыя Радзівілаў у Нясвіжы»), прызнаўся тады, што па жаночай лініі належыць да Радзівілаўскага роду. І нават стары-стары габрэй, гісторык мастацкай крытыкі, дысцыпліны ў дысцыпліне, Кауфман, паходзіў з Гомеля. З тыповым габрэйскім вымаўленнем пад добразычлівы смех аўдыторыі ён любіў назваць мяне «земляком».

Пашукаўшы, знайсці добрыя сувязі паміж беларусамі і Маскоўскім універсітэтам можна ва многіх сферах. Але ці гэта падстава не спрабаваць для студэнцкага свята ў нашай краіне падабраць больш адпаведную дату? Таццянін дзень — цудоўнае свята, хай яго ўспамінаюць усе, каму яно дарагое.

Я зноў хілюся да Вільні, тым больш што фармальна час 430-гадовага юбілею Віленскага універсітэта прыпадае на гэты год (1579–2009). Менавіта тады, 1 красавіка 1579 года, вялікі князь Стэфан Баторый выдаў прывілей на зацвярджэнне за Езуіцкай калегіяй (паўстала ў 1570) статуса універсітэта. Што сваёй булай 30 кастрычніка 1579 года пацвердзіў папа Рыгор XIII. Гэтае свята яднае нас з нашымі гістарычна адзінакроўнымі братамі, літоўцамі. Для нас і для іх Віленскі універсітэт — калыска навуковай і інтэлектуальнай традыцыі.

Сярод выпускнікоў акадэміі-універсітэта — Мялецій Сматрыцкі і Сімяон Полацкі. Амаль усе заснавальнікі мастацкай школы Беларусі XIX стагоддзя. Студэнты, заснавальнікі таварыстваў філаматаў і філарэтаў, паэты, пісьменнікі, грамадскія дзеячы — А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот, А. Ходзька. У Віленскім універсітэце ў працах М. Бабр оўскага і І. Даніловіча ў XIX стагоддзі нараджалася гістарычнае і тэарэтычнае разуменне беларускай дзяржаўнасці, актуальнае дасёння. А якія імёны ўвайшлі ў гісторыю геалогіі (І. Дамейка), хіміі (А.Снядэцкі), астраноміі (М.Пачобут-Адляніцкі)!

1 красавіка падаецца вельмі добрай датай. З XVI стагоддзя — гэта дзень смеху ва многіх еўрапейскіх краінах, «дзень дурня». Ці не ёсць у гэтым своеасаблівая логіка «ад супрацьлеглага» — хіба не студэнцтву больш за ўсё уласцівыя жыццесцвярджальная весялосць, іронія і самаіронія. Прапаноўваю абмеркаваць гэту тэму. Да юбілейнага 1 красавіка 2009 года яшчэ больш за 2 месяцы — можна паспець зрабіць перад гэтым вясёлым агульнапрызнаным святкаваннем адпаведныя акцэнты, каб з цягам часу займець свой, лагічна абгрунтаваны, беларускі Дзень студэнта.

ЗАЯВА ТБМ

# ДЗЯРЖАЎНУЮ МОВУ — НА ДЗЯРЖАЎНЫ КАНАЛ

**Кіраўніцтва грамадскага аб'яднання Таварыства беларускай мовы даслала кіраўніцтву Белдзяржтэ лерадыёкампаніі заяву «Аб вяртанні дзяржаўнай беларускай мовы на экраны БТ», дзе заклікае вярнуць мову карэннага насельніцтва ў тэлеэфір.**

«У апошнія гады беларуская мова выцеснена з усіх тэлеканалаў Беларускай дзяржтэлекампаніі. Атрымліваецца, што ў незалежнай дзяржаве — Рэспубліцы Беларусь — няма дзяржаўнага ўласнабеларускага тэлебачання, мова карэннага насельніцтва ў тэлеэфіры практычна адсутнічае. Такую сітуацыю нельга разглядаць іначай як дыскрымінацыю беларусаў па мове, што з'яўляецца грубым парушэннем Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Між тым, у суседняй з намі Расіі ў ліпені 2008 года прынята ўрадавая пастанова пра ахову і пашырэнне рускай мовы. Цікавай з'яўляецца моўная практыка ў Казахстане, дзе руская мова мае статус афіцыйнай. Тэлебачанне ў Казахстане прадугледжвае вяшчанне на дзяржаўнай казахскай мове не менш за палову эфірнага часу на кожным канале.

Рада ТБМ лічыць, што ў перадачах дзяржаўнага тэлебачання Беларусі беларуская мова павінна гучаць не менш за палову эфірнага часу і неабходна неадкладна распрацаваць Закон пра абарону і пашырэнне беларускай мовы, і каб прыняць яго да пачатку дзеяння новых арфаграфічных правілаў. Гэта паспрыяе ўмацаванню незалежнасці Рэспублікі Беларусь і надасць дынамікі яе духоўнаму і культурнаму адраджэнню», — гаворыцца ў заяве.

БУДЗЬМА

# НЕЗАБЫЎНАЯ СУСТРЭЧА

**Юрась КАЛАСОЎСКІ**

**У межах кампаніі «Будзьма» на сядзібе ТБМ адбылася сустрэча з сынам Якуба Коласа Міхасём Міцкевічам.**




На працягу вечарыны, якая доўжылася амаль тры гадзіны, спадар Міхась распавядаў прысутным пра сябе, пра бацьку, чытаў урыўкі з твораў Якуба Коласа, выказваў свае погляды на сучаснае жыццё Беларусі.

Шмат новага для сябе пачулі слухачы пра ўзаеміны Якуба Коласа і Янкі Купалы, пра тое, якім ён памятае Івана Дамінікавіча. Распавёў спадар Міхась і пра абставіны смерці абодвух класікаў. Паводле яго, прычынай смерці Янкі Купалы стаў, хутчэй за ўсё, няшчасны выпадак.

А вось Якуб Колас у апошні дзень жыцця, 13 жніўня, занёс у ЦК партыі Беларусі ліст пра гаротны стан беларускай мовы, пра тое, што трэба нацыянальнай мове надаць больш шырокі ўжытак. Але яго не прынялі. Вядома, з якім настроем паэт вярнуўся дадому. Пайшоў у свой рабочы кабінет… Народны паэт памёр у сваім крэсле. Цяпер спадар Міхась працуе над успамінамі пра бацьку, якія друкуюцца ў часопісе «Дзеяслоў».

Гаворачы пра сучасную Беларусь, Міхась Міцкевіч зазначыў, што людзі, якія губляюць сваю мову, напросту ператвараюцца ў гістарычнае смецце. Народ знікае, калі губляецца мова. Сённяшняе ж беларускае грамадства, на яго думку, вельмі апалітычнае і абыякавае да свайго лёсу. Прычына — у няведанні ўласнай гісторыі, у адсутнасці нацыянальнай самасвядомасці.

РЭПРЭСІІ

# ВЯЧОРКУ ЗАБРАЛІ Ў ВОЙСКА

**28 студзеня затрымалі Франака Вячорку і ў кайданках адвезлі ў Баранавіцкую вайсковую радыётэхнічную брыгаду.**

Толькі ўвечары ён змог паведаміць пра гэта свайму бацьку праз мабільны тэлефон.

«Ён ужо ў форме, і ў яго забралі цывільныя рэчы. Ён сказаў, што яго хапалі ў горадзе тыя ж самыя людзі ў цывільным, якія яго хапалі 8 і 16 студзеня на чале з тым жа самым спецслужбістам. Яны яго білі. Білі ў твар і галаву… Білі ў ваенкамаце. Білі ў кайданках. У кайданках амаль усю дарогу яго везлі ў вайсковую частку. Ён ужо паголены, і яму выдалі вайсковы строй. Я сказаў яму, што ў сувязі са збіццём трэба абавязкова пісаць ваеннаму пракурору. Высветлілася, што ў яго няма доступу да паперы і асадкі», — паведаміў «Свабодзе» Вінцук Вячорка.

Напярэдадні суд Савецкага раёна Мінска завочна прызнаў Франака Вячорку прыгодным да службы ў арміі.

Хлопец меў адтэрміноўку ад службы ў войску з-за аперацыі на вачах і праблемаў са здароўем.

Акрамя таго затрымалі і адвезлі спачатку ў ваенкамат, а потым у міліцыю актывіста «Маладога фронту» Змітра Хвядарука. Кіраўніка салігорскай філіі «Маладога фронту» Івана Шылу затрымалі дома і павезлі на прызыўны пункт у Мінск. Іван абвясціў галадоўку.

**Паводле БелаПАН**

ЛІСТ

# «ФАУНА ГОРАДА» ПРОСІЦЬ ДАПАМОГІ

**Валанцёры мінскага прадпрыемства па часовым утрыманні жывёл «Фауна горада» звярнуліся ў СМІ з адкрытым лістом, у якім просяць грамадскасць дапамагчы ва ўрэгуляванні сітуацыі на прадпрыемстве.**

Як зазначаецца ў звароце, «крытычная» сітуацыя ў «Фауне горада» склалася пасля ўваходжання 19 студзеня на пасаду новага дырэктара Аляксандра Тамашэўскага. Пасля чаго фактычна «пастаўлены крыж на зоаабароне, валанцёрскім руху, гуманным абыходжанні і рэгуляванні колькасці бяздомных жывёл».

Новы дырэктар, зазначаюць яны, у першы ж дзень знаходжання на пасадзе загадаў вызваліць тры пакоі ад клетак, дзе ўтрымліваецца больш за 50 катоў, і аддаць памяшканні пад адміністрацыйныя патрэбы. На ўладкаванне жывёл «у добрыя рукі» ён выдзеліў два дні.

Паводле інфармацыі валанцёраў, Тамашэўскі «загадаў спыніць і забараніць стэрылізацыю сабак на прадпрыемстве», а ўсіх пасляаперацыйных сабак з пакояў перавялі ў вальеры, «дзе яны напросту не выжывуць у агульных умовах».

23 студзеня, сцвярджаюць аўтары ліста, паступіла чарговае распараджэнне А. Тамашэўскага: да серады ўсыпіць усіх катоў і сабак, якія адстаялі на прадпрыемстве пяць дзён і больш, нават калі яны з пародай, яўна згубленыя, з ашыйнікам і жэтонам, стэрылізаваныя або апякаюцца валанцёрамі «Фауны горада» або «Эгіды». Дырэктар растлумачыў гэты загад запланаванай дэзінфекцыяй.

Пад зваротам падпісалася больш за 1100 чалавек.

АДМОВА

# ЛІБЕРАЛІЗАЦЫЯ ПА КАМАНДЗЕ

**«Гроднааблсаюздрук» не змог уцямна растлумачыць прычыны адмовы распаўсюджваць «Газету Слонімскую» і «Новы час» праз свае шапікі.**

Сябра Рады Руху «За Свабоду» Алесь Зарэмбюк атрымаў адказ на свой ліст ад 13 студзеня да кіраўніцтва «Гроднааблсаюздруку» наконт таго, чаму «Газета Слонімская» і «Новы час» не даходзяць да чытача праз дзяржаўную сістэму распаўсюду друкаваных выданняў. Дырэктар «Гроднааблсаюздруку» Тадэвуш Валчкевіч у сваім адказе паведаміў, што не мае дамовы на распаўсюд названых выданняў, а рашэнне пра тое, складаць з рэдакцыямі гэтых газет дамову ці не, — прэрагатыва УП «Гроднааблсаюздрук».

Фактычна, чыноўнік адмовіўся назваць прычыны, па якіх дзяржаўны манапаліст па продажу друкаванай перыёдыкі не супрацоўнічае з незалежнымі газетамі, і даў зразумець, што гэта не справа чытачоў. Дырэктар «Гроднааблсаюздруку» таксама параіў пашукаць названыя газеты ў сістэме «Белпошты» (як відаць, у гэтамтых каталогах іх дасюль няма), а таксама ў прыватных распаўсюднікаў.

«На гэтым прыкладзе яскрава бачна, што ўяўляе сабой абвешчаная ў краіне лібералізацыя. Чыноўнікі здольныя пайсці насустрач грамадству роўна настолькі, наколькі ім будзе дадзена каманда «зверху». Лібералізацыя павінна быць унутры самой сістэмы. Пакуль гэтага няма», — сказаў Алесь Зарэмбюк.

**Сайт Руху «За Свабоду»**

## СУСТРЭЧЫ

### БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ СТАНЕ БОЛЬШ

На сустрэчы старшыні ТБМ Алега Трусава са старшынёй Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Аляксандрам Зімоўскім 27 студзеня дасягнута дамоўленасць пра пашырэнне ўжытку беларускай мовы на айчынным тэлебачанні.

Былі разгледжаны сем прапаноў кіраўніцтву НДТРК. Бакі прышлі да згоды па пяці пунктах: заснаваць 10–15-хвілінную перадачу «Гаворым па-беларуску»; стварыць цыкл перадач на беларускай мове на гістарычную тэматыку, прычым першы цыкл прысвяціць 600-годдзю перамогі беларусаў у складзе войскаў Вялікага княства Літоўскага ў Грунвальдскай бітве; сумесна з Інстытутам мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАНБ зрабіць перадачу, прысвечаную 10-м угодкам Міжнароднага дня роднай мовы, заснаванага паводле рашэння ЮНЕСКА; раз на месяц ладзіць на тэлебачанні тэматычныя «круглыя сталы» па пытаннях беларускай мовы і культуры з удзелам грамадскіх арганізацый, у тым ліку ТБМ, Таварыства беларускай школы і Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына»; аднавіць дубляж замежных фільмаў на беларускую мову з далейшым паказам на айчынных тэлеканалах.

Разам з тым, паводле слоў старшыні ТБМ, дзве прапановы — зрабіць Першы нацыянальны ў перспектыве цалкам беларускамоўным, а рэкламу на роднай мове даваць па крыху меншым кошце, чым рускамоўную, — на думку Зімоўскага, патрабуюць асобнага разгляду.

### ЛІТВА ХАДАЙНІЧАЕ ЗА БЕЛАРУСЬ

Міністр замежных спраў Літвы Вігаўдас Ушацкас на сустрэчы з вярхоўным прадстаўніком Еўрасаюза Хаўерам Саланам 26 студзеня ў Бруселі адзначыў неабходнасць стварэння магчымасцей для Беларусі зблізіцца з ЕС.

Як паведамляе прэс-служба МЗС Літвы, бакі абмеркавалі перспектывы адносінаў ЕС і Беларусі. В. Ушацкас праінфармаваў Х. Салану пра свой візіт у Мінск у канцы снежня 2008 года, пра сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімірам Макеем і беларускім калегам Сяргеем Мартынавым.

Кіраўнік МЗС Літвы зазначыў, што збліжэнне Беларусі і ЕС можа адбывацца праз ініцыятыву Усходняга партнёрства ЕС. Паводле яго слоў, развіццё падобных двухбаковых адносінаў можа мець «станоўчы ўплыў на развіццё адкрытага грамадства, павагу дэмакратычных прынцыпаў у Беларусі, на вяршэнства закона і дзейнасць дзелавых суб'ектаў краін ЕС у Беларусі, якая заснавана на прынцыпах свабоднага рынку».

ПРАЕКТ

# «ПАЛЯКІ»



Генадзь КЕСНЕР

**У «Гістарычнай майстэрні» ў Мінску адбылася сталічная прэзентацыя дакументальна-публіцыстычнага фільма «Палякі» рэжысёра Міхала Мілашэўскага. Аўтарам ідэі стужкі з'яўляецца старшыня Рэспубліканскага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў этнограф Антон Астаповіч, аператарам і мантажорам — Сяржук Яноўскі.**

Па словах Антона Астаповіча, аўтары ставілі за мэту паказаць не толькі гісторыю існавання польскага этнасу на беларускіх землях.

«Увогуле, ідэя цыкла фільмаў пра нацыянальныя меншасці ў Беларусі нарадзілася не выпадкова. Вельмі часта і афіцыйныя ўлады, і афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі гавораць, што ў Беларусі існуе поўная міжнацыянальная гармонія, але мы жывем у гэтым грамадстве, штодзённа сутыкаемся з людзьмі і бачым, што праявы ксенафобіі ёсць і ў Беларусі, — адзначае Антон Астаповіч. — Але ж Беларусь — гэта унікальная зямля: калі ўзгадаць гісторыю, узгадаць Вялікае княства Літоўскае, то ў той час, калі ў Еўропе былі вялікія і міжканфесійныя, і міжнацыянальныя спрэчкі, якія даводзілі да вялікай крыві, на тэрыторыі ВКЛ, на тэрыторыі Рэчы Паспалітай былі пэўныя напружаныя моманты, але ж усё роўна мы можам ганарыцца, што міжнацыянальная, міжканфесійная талеранцыя на гэтых землях была заўсёды».

Па словах Астаповіча, «вельмі хочацца, каб гэтыя праекты паказалі, што ўсе мы аднолькавыя, што ўсе мы жывем на гэтай зямлі, і кожны мае права на свой погляд, на сваю культуру, на сваю мову, на свой лад жыцця. Самае галоўнае, каб мы вызнавалі, што мы ўсе жывем у агульнай беларускай прасторы, каб мы вызнавалі сябе грамадзянамі гэтай дзяржавы, каб мы вызнавалі, што ўсе мы павінны працаваць на карысць нашай Бацькаўшчыны».

Рэжысёр фільма Міхал Мілашэўскі быў лаканічны: «Я хацеў паказаць, што палітыка — раз'ядноўвае, але культура аб'ядноўвае. Я хацеў бы, каб у нашай дзяржаве была такая палітыка, якая б не раз'ядноўвала людзей».

У фільме закранаецца тэма лёсу арганізацыі польскай меншасці ў Беларусі. Як паведамляе голас за кадрам, «грамадска-палітычная сітуацыя як у Рэспубліцы Беларусь, так і за мяжой прывяла ў 2005 годзе да расколу Саюза палякаў, а гэта, у сваю чаргу, негатыўна




ўплывае на жыццё і дзейнасць усёй польскай абшчыны».

Адзін з герояў фільма, былы старшыня Мінскай абласной арганізацыі Саюза палякаў Канстанцін Тарасевіч кажа, што раскол у СПБ прывёў да ўзнікнення груповак: «Адну групоўку падтрымліваюць 15%, другую — каля 20%, астатнія палякі апынуліся па-за справамі, яны ўвогуле не ўдзельнічаюць ні ў якой працы, яны засталіся непатрэбныя нікому... Шэраг суполак увогуле спынілі сваё існаванне...» Зараз, па словах К. Тарасевіча, зніклі многія польскія класы ў школах як у Мінску, так і ў іншых гарадах Беларусі. «Уся віна за ўзніклую сітуацыю ляжыць на нас саміх, бо гэтыя нашы разлады, спрэчкі прывялі да таго, што палякі нават не вітаюцца адзін з адным на вуліцы. На пасады кіраўнікоў структур СПБ сёння прызначаюцца людзі, якія не павінны займаць такія пасады. З семнаццаці аддзелаў арганізацыі ў Мінскай вобласці толькі тры старшыні аддзелаў могуць размаўляць па-польску. На сходах не гучыць польская мова, усё справаводства вядзецца па-руску, дык пра якое адраджэнне польскай культуры можа ісці гаворка?» — пытаецца пан Тарасевіч.

І яшчэ шмат іншых праблем узнялі аўтары і героі фільма, характэрных не толькі для польскай меншасці ў Беларусі, але і для татараў, яўрэяў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў, як то адукацыя, працаўладкаванне і гэтак далей.

Зараз той жа аўтарскі калектыў працуе над аналагічнай стужкай, якая будзе распавядаць пра беларускіх татараў.

Дарэчы, кіраўнік нямецка-беларускага праекта «Гістарычная майстэрня» Кузьма Козак паведаміў, што 2 верасня ў Мінску адбудзецца навукова-практычная канферэнцыя «Беларусь і Польшча: часы выпрабавання. 1939–1941», прымеркаваная да 70-х угодкаў пачатку другой сусветнай вайны, у якой палякі і беларусы поплеч змагаліся з фашызмам.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ВОСЕНЬ ПАТРЫЯРХА

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Самай чаканай падзеяй тыдня былі выбары патрыярха Маскоўскага і ўсяе Русі. Гэтая падзея была не абыякавая і беларусам — 25 студзеня Архірэйскі сабор вырашыў, што мітрапаліт Мінскі і Слуцкі патрыяршы экзарх усяе Беларусі Філарэт стаў адным з трох кандыдатаў на Маскоўскі патрыяршы пастол.**

Па выніках галасавання ён заняў трэцяе месца (16 галасоў) — пасля мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага Кірыла (97), Калужскага і Бароўскага Клімента (32).

Шанцы Філарэта стаць на чале Рускай праваслаўнай царквы хоць маленькія, але былі. Аднак на выбарах на памесным саборы, які праходзіў 27 студзеня ў Маскве, ён узяў самаадвод і заклікаў сваіх прыхільнікаў галасаваць за месцаахоўніка патрыяршага прастола мітрапаліта Смаленскага і Калінінградскага Кірыла. І, такім чынам, Кірыл стаў патрыярхам.

Невядома, што падштурхнула Філарэта да такога кроку. Тыя кадры, якія мы бачылі па ўсіх тэлеканалах, абсалютна непераканаўчыя: Філарэт кажа пра тое, што ён здымае сваю кандыдатуру дзеля адзінства выбаршчыкаў. «Мы павінны быць адзінадушныя, таму я і зняў сваю кандыдатуру. Гэта не паказчык нейкага негатыва, пратэсту», — казаў Філарэт.

Можа, гэта было зроблена сапраўды для адзінадушша. А можа, Філарэт падумаў пра наступствы свайго абрання. Так што самаадвод, хутчэй за ўсё, рэч больш прагматычная, чым маральная. А можа, і тое і другое разам.

На тыдні ў беларускім Клубе Вясёлых і Знаходлівых разгараўся зусім не жартоўны скандал. Удзельнікі Беларускага КВЗ скіравалі калектыўны ліст да прэзідэнта Міжнароднага саюза КВЗ Аляксандра Маслякова з заклікам не дапусціць выкарыстання найбуйнейшага міжнароднага маладзёжнага руху на тэрыторыі былога СССР асобнымі чыноўнікамі ад КВЗ у карыслівых мэтах.

Падпісанты ліста — гульцы камандаў КВЗ — абвінавачваюць у карыслівых мэтах старшыню праўлення МГА «Беларускі КВЗ» Андрэя Мукавозчыка. Лічаць, што ён дзейнічае «ў разрэз з пазіцыяй не толькі сябраў праўлення «Беларускага КВЗ», але і інтарэсаў усяго Кавээзоўскага руху Беларусі. Асабліва яскрава, па меркаванні аўтараў ліста, гэта праявілася ў апошні год, калі ў А. Мукавозчыка ўзнік персанальны канфлікт з кіраўніцтвам ТАА «АМіК». Дзеянні Мукавозчыка прывялі да пазбаўлення Еўралігі, якая праводзілася ў Мінску, статуса лігі Міжнароднага саюза КВЗ, што нанесла істотны ўрон інтарэсам беларускіх каманд КВЗ.

Падпісанты таксама негатыўна ацэньваюць ультыматум А. Мукавозчыка да кіраўніцтва ТТА «АМіК» адносна закрыцця дзейных у Беларусі падраздзяленняў гэтага аб'яднання і адмены правядзення ў Мінску ў 2009 годзе турніру Першай лігі Міжнароднага саюза КВЗ.

Сам Мукавозчык з абвінавачваннямі не згодны. «Кавээшнікі, якія падпісалі ліст, — практычна ўсе сябры ТТА «АМіК», — пракаментаваў ліст А. Мукавозчык 27 студзеня на прэс-канферэнцыі ў Мінску. Паводле яго слоў, канфлікт паміж ТТА «АМіК» і МГА «Беларускі КВЗ» узнік у красавіку 2007 года.

Паводле яго меркавання, у бедах беларускага КВЗ вінаваты кіраўнік Вышэйшай лігі КВЗ — Аляксандр Маслякоў, які «незаконна прыватызаваў» таварны знак «КВЗ» у 1996 годзе, калі па яго заяве правы на гульню пад назвай «КВЗ» былі замацаваныя ў пасведчанні Расійскай аўтарскай супольнасці. У 1997 годзе А. Маслякоў таксама атрымаў міжнародныя правы на выкарыстанне таварнага знака «КВЗ».

Кіраўніцтва МГА «Беларускі КВЗ» атрымала ліст, у якім паведамлялася, што ўсе мерапрыемствы, у назве якіх прысутнічае таварны знак «КВЗ», могуць праводзіцца толькі з пісьмовага дазволу праваўладальніка — ТТА «АМіК». За выкарыстанне таварнага знака «КВЗ» ТТА «АМіК» мела намер збіраць плату. Паводле меркавання А. Мукавозчыка, дзеянні ТТА «АМіК» нелегітымныя, што даказана рашэннем Вярхоўнага суда Беларусі і арбітражнага суда Масквы. «Я лічу, што Беларускім КВЗ павінны кіраваць беларускія кавээшнікі, а не ТТА «АМіК», — сказаў ён. А. Мукавозчык таксама заявіў, што задача МГА «Беларускі КВЗ» найперш даваць усім камандам шанец удзельнічаць у гульні, а не рыхтаваць Вышэйшую лігу КВЗ.

Хто правы, хто вінаваты ў нежартоўным скандале, будуць вырашаць самі кавээшнікі і суды. Але ж будзе вельмі цікава, калі ў Беларусі з'явіцца два КВЗ.

А тым часам Беларусь ціхай сапай на мяккіх лапах пракрадваецца ў бок Еўропы. 26–28 студзеня па запрашэнні чэшскага старшынства ў Еўрасаюзе Брусель наведаў міністр замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў. Ён правеў перамовы з кіраўнікамі знешнепалітычных ведамстваў Чэхіі, якая цяпер старшынствуе ў ЕС, і Швецыі — наступнага старшыні, а таксама з высокапастаўленымі прадстаўнікамі Еўракамісіі і Генеральнага сакратарыята Савета ЕС. Тэма перамоў — стан і перспектывы развіцця дыялогу паміж Беларуссю і Еўрасаюзам.

Як паведаміла прэс-служба МЗС Беларусі, пасля заканчэння сустрэчы з «тройкай» ЕС (еўракамісар па знешніх сувязях Беніта Ферэра-Вальднер, начальнік палітычнага аддзела генеральнага сакратарыята Савета ЕС Хельга Шмід і міністр замежных спраў Чэхіі, якая старшынствуе ў ЕС, Карэл Шварцэнберг) беларускі міністр замежных спраў зрабіў заяву для журналістаў. Паводле яго слоў, «значная ўвага была нададзена праграме Усходняга партнёрства ЕС». С. Мартынаў выказаў пазітыўнае стаўленне да ідэі і канцэпцыі Усходняга партнёрства, пазітыўна ацаніў дакумент у яго цяперашнім выглядзе. Беларускі бок чакае «таго, што пры канчатковым узгадненні ён будзе ўтрымліваць неабходныя палажэнні для забеспячэння роўнага шматбаковага ўдзелу дзяржаў», — зазначыў міністр.

Адзінае, што не паведаміла прэс-служба МЗС, — Беларусь не ўдзельнічае ў праграме Усходняга партнёрства ЕС, «пакольκі насамрэч існуе шмат сумненняў у дэмакратычнасці краіны». Пра гэта яшчэ 23 студзеня ў інтэрв'ю «Радыё Свабода» заявіла тая ж Беніта Ферэра-Вальднер. Так што еўрапейцы проста паслухалі Мартынава — і ўсё. А высновы яны будуць рабіць не са словаў, а са спраў.

РАДА

# РЭЦЭПТЫ ЛІБЕРАЛІЗАЦЫІ: ДРАБОК СВАБОДЫ І КОЎШ АБЯЦАННЯЎ

Вольга ХВОІН

**Пры Адміністрацыі прэзідэнта ствараецца Грамадска-кансультатыўная рада. Упершыню за апошнія гады ў склад дзяржаўнага органа запрошаны прадстаўнікі ад апазіцыі — старшыня Таварыства беларускай мовы Алег Трусаў, старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта Алег Гулак, экс-кіраўнік Нацбанка Станіслаў Багданкевіч, эканаміст Леанід Заіка, палітык Уладзімір Нісцюк. Таксама прапанову вылучыць у склад рады сваіх прадстаўнікоў атрымаў рух «За свабоду». Узначальвае раду кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей, персона якога адыгрывае значную ролю ў развіцці дыялогу з Захадам.**

Мэта ствараемага органа — «абмеркаванне пытанняў развіцця дзяржавы і грамадства, выпрацоўка прапаноў па больш актыўным далучэнні да агульнасусветных працэсаў, удасканаленне напрамкаў сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця краіны», гаворыцца ў паведамленні на сайце прэзідэнта.

У інтэрв'ю БелаПАН першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч паведаміла, што «рада ствараецца для абмеркавання актуальных пытанняў грамадска-палітычнага развіцця беларускага грамадства». «Гэта рада можа разглядаць пастаўленыя перад ёй пытанні, прымаць рашэнні і выносіць рэкамендацыі, якія потым могуць улічвацца пры прыняцці рашэнняў у той ці іншай сферы грамадскага жыцця», — сказала першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта. Паводле слоў Пяткевіч, у склад рады ўвайшлі прадстаўнікі як дзяржаўных структур, так і недзяржаўных арганізацый: «Пакуль персанальны склад савета да канца не сфарміраваны, ён будзе апублікаваны пазней. Аднак я магу сказаць, што ў яго павінны ўвайсці таксама прадстаўнікі палітычных партый, у тым ліку і апазіцыйных. Прынамсі, яны былі запрошаны для ўдзелу ў рабоце рады».

На момант падрыхтоўкі матэрыялу было вядома, што ні прадстаўнікоў ад партыі БНФ, ні ад ПКБ у раду не запрасілі. Намеснік старшыні партыі БНФ Віктар Івашкевіч такі падыход да адной з найбольш вядомых партый краіны відавочна не ўхваляе. Месца ў радзе руху «За свабоду» як інстытуцыі (астатнія запрашэнні былі персанальныя) спадар Івашкевіч патлумачыў так: «Думаю, такой увагі грамадскае аб'яднанне заслужыла за канструктыўнае і пазітыўнае прадстаўленне беларускага рэжыму на міжнароднай арэне. На апошнім сойме партыі БНФ была прынята рэзалюцыя, у якой ёсць патрабаванне даць інфармацыю, калі і ў якім аб'ёме ўлады збіраюцца зноў абкрасці людзей. Гэта не пазітыўна і не канструктыўна, таму нам няма месца ў гэтай радзе».

Як доказ палярных адносінаў палітычных сілаў да ўлады спадар Івашкевіч нагадаў выказванне Аляксандра Мілінкевіча пра тое, што пад абломкамі рэжыму можа загінуць Беларусь, і трэба прытрымлівацца паступовай эвалюцыі сістэмы дзяржаўнага кіравання. «Я думаю, што рада задумваецца хутчэй як дэкаратыўны орган. Ці паўплываюць яе рашэнні на сітуацыю ў краіне, у большай ступені залежыць ад развіцця эканамічнай сітуацыі, і ў меншай ступені — ад людзей, якія запрошаныя ў склад рады», — адзначае палітык.

Стварэнне ў Беларусі Грамадска-кансультатыўнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта АБСЕ ацаніла як станоўчую ініцыятыву. «Мы будзем падтрымліваць гэтую ініцыятыву», — адзначыў кіраўнік Офіса АБСЕ ў Мінску Ганс-Ёган Шміт.

Афіцыйны Мінск за апошні час стварыў цэлы шэраг нагодаў, каб Еўропа глянула на дзяржаву прыхільным позіркам. 27 студзеня па запрашэнні чэшскага прадстаўніцтва ў ЕС кіраўнік Міністэрства замежных спраў Беларусі Сяргей Мартынаў у Бруселі даў справаздачу пра выкананне Мінскам «хатняга задання» ў дванаццаці сферах. Еўракамісар па знешніх сувязях і палітыцы добрасуседства Беніта Ферэра-Вальднэр адзначыла падчас сустрэчы, што Мінск ідзе «дакладнай дарогай».

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства Беларусі Сяргей Мартынаў паведаміў, што значная ўвага падчас візіту было нададзена новай палітыцы Усходняга партнёрства Еўрасаюза. Яна прадугледжвае палітычнае і эканамічнае збліжэнне ЕС з шасцю постсавецкімі краінамі. Між іншым, нядаўна ў Чарнігаве на гэтую ж тэму гаварыў з прэзідэнтам Украіны Віктарам Юшчанкам кіраўнік Беларусі. Еўропа высока ацаніла дзеянні Беларусі ва ўмовах газавага канфлікту паміж Украінай і Расіяй, вялася размова пра супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі, а таксама пра захады па пераадольванні наступстваў эканамічнага крызісу супольна з Еўрасаюзам.

Сярод крокаў афіцыйнага Мінска, што нібы бальзам на рану Еўрасаюза, можна назваць рэгістрацыю руху «За свабоду», вяртанне ў распаўсюд двух недзяржаўных газет (а колькі яшчэ выданняў знаходзяцца ў становішчы нелюбімых папялушак!), стварэнне кансультацыйнай рады пры Адміністрацыі прэзідэнта і працоўнай групы па СМІ. Але ўсе гэтыя дзеянні, пры іх знешняй прывабнасці, пакуль не нясуць істотных зменаў палітычнай сітуацыі Беларусі. У любы момант можа быць дадзеная каманда вярнуць усё на свае месцы, і зрабіць гэта будзе проста, бо незваротных крокаў пакуль не было. Але калі тэндэнцыя касметычных прыўкрас працягнецца, то ў красавіку Еўропа можа і скасаваць уведзеныя раней санкцыі.

МЕРКАВАННІ

# КУПІЎ НЕ КУПІЎ, А ПАТАРГАВАЦЦА МОЖНА

**Яшчэ нядаўна прадстаўнікі апазіцыйнага боку чулі ад кіраўніка дзяржавы на свой адрас «адмарозкі» і «шалудзівыя людзі». Сёння ім прапануюць сесці за стол перамоў з уладамі ды распачаць супольную працу па вызначаных кіраўніцтвам краіны накірунках. З пытаннем пра тое, як можна ацаніць такія захады ўладаў, мы звярнуліся да тых, каго запрасілі да ўдзелу ў новастворанай Грамадска-кансультатыўнай радзе пры Адміністрацыі прэзідэнта.**

**Алег Трусаў, старшыня ГА «Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны»:**



— Запрашэнне да працы я атрымаў прыкладна тыдні два таму. Але маўчаў, бо нічога пэўнага не было вядома. Мяне запрасілі ў раду, патлумачыўшы, што яна будзе збірацца раз на два месяцы, каб абмяркоўваць актуальныя пытанні. Наколькі тое будзе плённа, у многім залежыць ад людзей: ці знойдуць яны агульную мову паміж сабой, ці будуць прытрымлівацца агульнай пазіцыі. Бо можа атрымацца як у нашай апазіцыі: Мілінкевіч — у свой бок, Лябедзька — у свой, Баршчэўскі таксама сам па сабе. Увогуле, для мяне праца ў гэтай радзе не настолькі важная. Я і так цесна працую з чыноўнікамі, і яны ведаюць мае прапановы, маю пазіцыю. Сёння даслаў апошні ліст міністру інфармацыі Русакевічу, нядаўна сустракаўся з Зімоўскім — гаварылі пра беларусізацыю тэлебачання. Сам па сабе працэс стварэння рады станоўчы, гэта не прынясе шкоды ні правым, ні левым. А вось эфектыўнасць яе працы пакажа час.

**Станіслаў Багданкевіч, былы старшыня Нацыянальнага банка Беларусі:**



— Я станоўча ацэньваю гэта. Калі мы 15 год не размаўлялі адзін з адным па віне ўладаў, то цяпер, маючы такую магчымасць, трэба яе выкарыстаць. Жыццё пакажа, ці будзе гэта плюс. Тыя, хто лічыць, што гэта няправільна, могуць яшчэ 15 год чакаць. Я асэнсавана даў сваю згоду на ўдзел у радзе. Мне сказалі па тэлефоне, што будзе прадстаўлена не менш палова апазіцыйных структур. Між іншым, я ў Грамадска-кансультацыйнай радзе прадстаўляю Аб'яднаную грамадзянскую партыю. То бок пакуль гаворка ішла пра развіццё грамадзянскай супольнасці, а не вырашэнне эканамічных праблем.

**Уладзімір Нісцюк, палітык:**



— Як нармальнаму чалавеку, мне зразумела, што сітуацыя, якая сёння склалася ў самой Беларусі і вакол яе, патрабуе ад улады новых крокаў. Разумее гэта і кіраўніцтва краіны. Стварэнне шэрагу дарадчых органаў з удзелам прадстаўнікоў апазіцыі можа наблізіць светлы час перабудовы палітычнай сістэмы дзяржавы. Пачатак заўсёды адбываецца па форме, маленькімі крокамі. Відавочна, што новая каманда прэзідэнта па-іншаму глядзіць на многія рэчы. І гэта пазітыўна, гэта спроба паставіць хоць нейкі буфер паміж супрацьстаяннем бакоў. Нават калі сябры рады не будуць мець вялікіх магчымасцяў для ўплыву на дзяржаўныя рашэнні, яны атрымаюць магчымасць давесці свой пункт гледжання да кіраўніцтва краіны. Істэрыка вакол сітуацыі неабгрунтаваная, бо гэта карысна дзяржаве, у якой мы жывём. Нядрэнна было б, калі б падобная арганізацыя супрацоўніцтва адбывалася па іншых накірунках. У Грамадска-кансультатыўнай радзе пры Адміністрацыі сабраліся прыстойныя людзі, і мне прыемна працаваць у такой кампаніі. Прыемна, што цяпер з'явілася якая-ніякая магчымасць сістэмна ўплываць на сітуацыю, апазіцыя марыла пра гэта многа гадоў. За маё лаяльнае стаўленне да ўладаў калегі па апазіцыі ставіліся да мяне не вельмі добра, называючы агентам розных спецслужбаў. Але я заўсёды выступаў за тое, што наша краіна не перажыве рэвалюцыю. Таму трэба шукаць кампрамісы, эвалюцыйны шлях.

**Алег Гулак, старшыня Беларускага Хельсінскага камітэта:**



— Пакуль мы не атрымалі палажэнне, таму складана казаць пра тое, што з сябе будзе ўяўляць Грамадска-кансультатыўная рада. Але зразумела, што гэты кансультатыўны орган, таму абавязковых для выканання рашэнняў ён не можа прымаць. Я са свайго боку пастараюся, каб праца гэтай рады была не проста шырмаю. З боку праваабаронцаў ёсць агульнае меркаванне, што трэба выносіць да абмеркавання праблемы з правамі чалавека ў Беларусі і прапаноўваць шляхі іх вырашэння.

КРЫЗІС

# НАСТУПСТВЫ НЕДАЛЬНАБАЧНАСЦІ

Вольга ХВОІН

**«Сітуацыя ў эканоміцы Беларусі стабільная, хаця і няпростая», — так ахарактарызаваў сучасны стан краіны віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў падчас сустрэчы з журналістамі. Незалежныя эксперты сыходзяцца ў меркаванні, што ў Беларусі даўно прагрэсіруе сістэмны крызіс дзяржаўных інстытуцыяў, што моцна перашкаджае цяперашнім намерам урада пераадолець эканамічныя праблемы.**



## Схавацца пад валютную «падушку»

Віцэ-прэм'ер Андрэй Кабякоў адзначыў, што складанасці звязаныя з адкрытасцю айчыннай эканомікі — доля экспарту ў валавым унутраным прадукце краіны складае больш за 70 працэнтаў. Для параўнання віцэ-прэм'ер прывёў дадзеныя па Расіі і Украіне — 30 і 40 працэнтаў адпаведна. За 11 месяцаў 2008 года таваразварот з Расіяй склаў каля 32 мільярда долараў, з ЕС — 21 мільярд. Чыноўнік адзначыў, што Беларусь крызіс закрануў значна пазней, чым краіны-суседкі: у знешнегандлёвых партнёраў упаў спажывецкі попыт, і толькі мінулай восенню гэта пачало адбівацца на нашай краіне.

Каб пераадолець фінансава цяжкія часы, урад распрацаваў шэраг мер. З іх спадар Кабякоў назваў павелічэнне статутных фондаў дзяржбанкаў, гарантаванне банкаўскіх ашчаджэнняў, абмежаванне авансавых плацяжоў, скарачэнне бюджэту, рашэнне пераацаніць запасы, кантроль за імпартнымі закупкамі. Акрамя таго, кіраўніцтва краіны спрабуе лібералізаваць, то бок спрасціць умовы для вядзення бізнесу. Прымаюцца меры, каб забяспечыць стабільную працу валаўтваральных прадпрыемстваў (па словах віцэ-прэм'ера, іх 166), кожнае з іх кантралюецца.

Палегчыць жыццё абраным урадам прадпрыемствам плануецца крэдытамі, стварэннем і падтрымкай таварных сетак за мяжой, аптымізацыяй выдаткаў і грашовай дзяржпадтрымкай, у прыватнасці будуць паніжаныя тарыфы на энергарэсурсы, часова адмененыя мыты.

Падправіць сітуацыю ў цэлым кіраўніцтва краіны збіраецца за кошт крэдытных сродкаў. Праўда, на другі дзень пасля выступлення віцэ-прэм'ера стала вядома, што Расія адмовіла Беларусі ў пазыцы 100 мільярдаў рублёў. Накіраваць гэтыя грошы планавалася на падтрыманне ўзроўню ўзаемнага гандлю паміж Беларуссю і Расіяй. «У іх былі ў лістах лічбы — 100 мільярдаў рублёў. Мы гэта нават не разглядаем», — заявіў намеснік Міністэрства фінансаў Расіі Дзмітрый Панкін. Мінулай восенню Масква ўхваліла выдачэнне Беларусі дзяржаўнага крэдыту ў 2 мільярда долараў, з якіх 1 мільярд быў пералічаны Мінску яшчэ ў лістападзе. Другі транш крэдыту будзе перададзены Беларусі пасля падпісання плану сумесных дзеянняў дзвюх краін па пераадоленні наступстваў сусветнага фінансавага крызісу.

Гэтыя грошы плануецца накіраваць на стварэнне «падушкі» бяспекі для падтрымання золатавалютных рэзерваў і дадатнага сальда плацежнага балансу. Намеснік старшыні Нацбанка Павел Калаур паведаміў, што ў студзені назіраецца скарачэнне паступлення валютных сродкаў. З улікам міжнародных крэдытаў, якія Беларусь ужо атрымала, золатавалютныя запасы паменшыліся на 100 мільёнаў долараў. Усяго на 1 студзеня 2009 года золатавалютныя рэзервы склалі 3,061 мільярда долараў.

Міністр эканомікі Мікалай Зайчанка спрагназаваў ВУП на канец бягучага года на ўзроўні 100 працэнтаў, то бок без росту. Гадавыя паказчыкі развіцця эканомікі ўрад хутчэй за ўсё перагледзіць, ацаніўшы сітуацыю па выніках першага квартала.

## Крызіс галавы

Пасля публічнага выступлення прадстаўнікоў беларускага ўраду, ацэнку эканамічнаму становішчу краіны паспрабавалі даць незалежныя эканамісты і прадстаўнікі свабоднага прафсаюза, сабраўшыся за адным дыскусійным сталом.

Беларусь найперш перажывае сістэмны крызіс, які пачаўся яшчэ ў 1990-я гады. І гэта толькі пагаршае фінансавую сітуацыю. Эканамічная мадэль развіцця краіны не была гатовая да неспрыяльных перамен. Запазычанасць, якая з'яўлялася цягам апошніх гадоў, лёгка сплочвалася за кошт звышпрыбыткаў ад гандлю нафтаю і нафтапрадуктамі. Ад абвалу ратаваў рост імпарту аб'ёмаў нафты, на якую ў гэты час раслі кошты. Гэта была вялікая ўдача для краіны. Але яна не скарысталася рэсурсамі для мадэрнізацыі прадпрыемстваў, у выніку ўся высокатэхналагічная вытворчасць адстала ад сусветных тэндэнцый. Цяпер мы можам спаборнічаць толькі ў галінах, якія звязаныя з перапрацоўкай сыравіны ды сумежных з імі.

Абвал коштаў на нафту выклікаў праблемы з выплатамі кароткатэрміновых пазыкаў. Але насцярожвае, што выконваецца стары план дзеяння эканомікі: прадпрыемствы па-ранейшаму працягваюць імкнуцца выканаць паказчыкі, даведзеныя зверху, і працуюць на склад. «Мы не здолелі прыстасавацца да крызісу, і гэта — галоўная праблема. Гавораць, што ў нас няма фінансавых рынкаў і мы не залежым ад крызісу. Але крызіс звёў да нуля магчымасці кароткатэрміновых пазык. Інвестары спынілі сваю працу. Такім чынам, магчымасці для фінансавання дэфіцыту зменшыліся. Доля дзяржаўнай запазычанасці, у параўнанні з мінулым годам, істотна вырасла. Ці хопіць сродкаў апошніх пазыкаў?» — задае пытанне эканаміст Аляксандр Чубрык.

Былы старшыня Нацыянальнага банка Станіслаў Багданкевіч да ацэнкі цяперашняй сітуацыі падыходзіць менш скептычна. «Мяне крытыкуюць, што абараняю ўлады, але на пачатак гэтага года сітуацыя ў эканоміцы Беларусі склалася не такая ўжо і дрэнная. Рост валавога ўнутранага прадукту — дзесяць працэнтаў за год, дзяржаўны бюджэт у плюсе. Органы дзяржкіравання трымаюць на сваіх рахунках дзесяць трыльёнаў рублёў. То бок яны крэдытуюць банкі, а не банкі іх, — адзначае эксперт. — Што такое крызіс, мы бачым па высокаразвітых краінах. Гэта дэфіцыт бюджэту, рост беспрацоўя, неліквіднасць банкаўскай сістэмы, крызіс дэпазітнага і крэдытнага яе складнікаў. Калі адкінуць дэталі, то мы знаходзімся толькі на пачатку шляху, мы яшчэ толькі ідзём да крызісу».

Паводле Багданкевіча, у Беларусі фінансавы крызіс пакуль праявіўся ў асобных сферах: першае — гэта дэфіцыт гандлёвага балансу (6,2 мільярда долараў складае адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі. У параўнанні з 2007-м гэта больш на 44,7 працэнта), што стварае ўмовы для жыцця ў пазыку. Інфляцыя ў краіне выражаецца двухзначнай велічынёй і залежыць ад лішкаў грашовай масы. Адбываецца збаласаванне цэнаў з гэтай масай, кошты вымушаныя расці, і ўказамі іх не спыніш. Другая прычына інфляцыі — адсутнасць канкурэнцыі на рынку. Калі ў першым вінаваты Нацыянальны банк, які праводзіць несамастойную палітыку, то ў другім вінаватыя ўлады, якія не далі магчымасцяў развівацца малому бізнесу.

Глабальны паказчык, які гаворыць, што мы маем праблему ў сферы малога бізнесу, — удзельная вага імпарту ў валавым прадукце. «Калі ён складае 70 працэнтаў, то гэта гаворыць, што ў нас няма нацыянальнай эканомікі. Я тысячу разоў прапаноўваў на тры гады вызваліць сямейны бізнес ад якіх-кольвек падаткаў. Магчыма, гэтае ўзбагачэнне людзей было б не заўсёды справядлівае, але гэта дазволіла б стварыць абаротны капітал і ўзняць узровень жыцця ўсяго грамадства», — адзначае Станіслаў Багданкевіч.

## Выйсце ёсць?

Эканамісты сышліся ў меркаванні, што напрыканцы мінулага года на штучнае падтрыманне беларускага рубля былі змарнаваныя вялікія сродкі. Дэвальвацыю можна было пачаць на пару месяцаў раней, патлумачыўшы, чым выкліканыя гэтыя непапулярныя меры.

«На ўнутраным рынку попыт на імпарт усё яшчэ высокі, бо беларускі рубель адносна стабільны. Урад трымае рубель, і насельніцтва гэтым карыстаецца. Цяпер праз тое, што еўра моцна патаннеў у адносінах да долара, Нацбанк прыйшоў фактычна да тых жа пазіцый, з якіх пачынаў, — тлумачыць Аляксандр Чубрык. — І будзе вымушаны пайсці на далейшую дэвальвацыю. Калі пачаць дэвальвацыю, то давер да нацыянальнай валюты канчаткова страціцца. Людзі паздымаюць дэпазіты. У Нацбанка рэзерваў, каб выплаціць дэпазіты, хопіць. Але ў банкаў грошай няма. Нацбанк мусіць надрукаваць грошы і выдаць іх іншым банкам. Атрымліваецца, мы ратуем банкі, але не ўтрымаем курс», — падсумоўвае эканаміст.

Аляксандр Чубрык падзяліўся вынікамі аналізу і прагнозам, які зрабілі незалежныя эканамісты: «Мы зрабілі макраэканамічную мадэль беларускай эканомікі па вельмі лагоднаму сцэнару. Уявім сабе, што Нацбанк будзе праводзіць жорсткую манетарную палітыку, то бок не будуць друкавацца грошы — мы заклалі прырост грашовай масы на працягу года толькі на 20 працэнтаў — і будзе трымацца дадатная стаўка рэфінансавання. На сённяшні дзень 13,3 працэнта — значна ніжэй за сапраўдную інфляцыю. Урад робіць свае захады па лібералізацыі эканомікі. У выніку мы атрымалі нулявы рост ВУП па выніках года, падзенне рэальных заробкаў, блізкі да нуля рост інвестыцыяў, спажывання. Карэктуецца наш знешні гандаль. Цяпер у нас дэвальвацыя меншая, чым у Расіі, і надалей нам давядзецца істотна дэвальваваць, каб падтрымаць экспарцёраў».

Палітолаг Віталь Сіліцкі адзначыў, што для ўладаў абменны курс — своеасаблівы сацыяльны кантракт, за кошт якога насельніцтву гарантуецца стабільнасць: «Калі забраць гэта, то трэба прапанаваць нешта ўзамен. А прапанаваць няма чаго».

Цяпер, паводле экспертаў, усё залежыць ад дзеянняў урада. Былі названыя магчымыя крокі, якія маглі б зніверляваць наступствы эканамічнага крызісу: дэбюракратызаваць эканоміку, панізіць падаткі для рэальнага сектара, закрыць ці рэфармаваць стратныя прадпрыемствы, змяніць працэнтную крэдытную палітыку, утаймаваць інфляцыю, пазбавіцца ад складскіх запасаў ды іншыя. Але найперш у дзяржаве мусіць быць вяршэнства закона, што дало б суб'ектам гаспадарання ўпэўненасць у заўтрашнім дні.

Пры ўсіх негатыўных фактарах удзельнікі дыскусіі сышліся ў меркаванні, што гэты год — год велізарных эканамічных і палітычных магчымасцяў. Ёсць верагоднасць наблізіць да ўвасаблення ў рэальнасць тое, што затрымлівалася дзяржаўнай машынай гадамі. І гэтым трэба карыстацца, каб рэфармаваць краіну, палітычную і эканамічную сістэму.

ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА

# НЕ — СМЯРОТНАМУ ПАКАРАННЮ

Генадзь КЕСНЕР

**У Беларусі пачалася кампанія «Праваабаронцы супраць смяротнага пакарання», мэта якой — спыненне прымянення гэтага віду пакарання і далучэнне краіны да агульнаеўрапейскіх каштоўнасцей.**

Па словах віцэ-прэзідэнта Міжнароднай федэрацыі правоў чалавека Алеся Бяляцкага, Беларусь засталася апошняй еўрапейскай краінай і апошняй краінай на постсавецкай прасторы, дзе існуе смяротнае пакаранне, і нягледзячы на тое, што ўлады апошнія гады гавораць пра магчымыя змены, пра тое, што смяротнае пакаранне носіць абмежаваны характар, тым не менш, яно рэальна ўжываецца.

«Таму мы правялі перамовы, у першую чаргу, з *Amnesty International* — міжнароднай праваабарончай арганізацыяй, адным з прыярытэтаў дзейнасці якой з'яўляецца праблема смяротнага пакарання, і вырашылі правесці сумесную кампанію як на міжнародным, так і на беларускім узроўні», — паведаміў Алесь Бяляцкі.

Па словах віцэ-прэзідэнта МФПЧ, кампанія будзе доўжыцца ўвесь 2009 год і мае мэць некалькі накірункаў: распаўсюд інфармацыі пра сітуацыю са смяротным пакараннем у Беларусі, збор меркаванняў людзей у Беларусі людзей па гэтым пытанні, збор меркаванняў юрыстаў, людзей, якія могуць суаднесці гэты від пакарання з міжнароднай практыкай і з



рэальным уплывам на крымінагенную сітуацыю ў краіне. Плануецца таксама абмеркаванне этычных момантаў смяротнага пакарання з рознымі рэлігійнымі канфесіямі, што існуюць у Беларусі, і давядзенне іх высноваў да людзей.

Таксама будуць распаўсюджвацца інфармацыі праз сайты праваабарончых арганізацый, праводзіцца сумесныя «круглыя сталы», а таксама конкурсы літаратурных эсэ на адпаведную тэматыку і іншыя мерапрыемствы з удзелам грамадскасці. «Наша задача — паспрабаваць зняць гэтае пытанне з рэальнасці беларускага жыцця», — падкрэсліў Алесь Бяляцкі.

Беларусь з'яўляецца ўдзельніцай Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, які хоць і не прадугледжвае абавязковай адмовы ад смяротнага пакарання, але накіроўвае краіны да абмежавання ўжывання і адмены выключнай меры пакарання. Аднак Рэспубліка Беларусь да гэтага часу не далучылася да Другога факультатыўнага пратаколу да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, накіраванага на адмену смяротнага пакарання (прыняты Генеральнай Асамблеяй ААН 15 снежня 1989 года). Дзяржавы, якія пагадзіліся ўдзельнічаць у гэтым пратаколе, абавязаліся адмяніць гэты від пакарання.

Тым часам у Міністэрства юстыцыі Беларусі пададзены дакументы на рэгістрацыю Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Наша вясна». На ўстаноўчым сходзе арганізацыі, які адбыўся ў Мінску 18 студзеня, Алесь Бяляцкі быў абраны старшынёй гэтага аб'яднання.

Па словах Алеся Бяляцкага, апошняя спроба зарэгістравацца была ў 2007 годзе, але яна не мела поспеху. «Зараз, улічваючы завярэнні беларускіх уладаў, што яны гатовы лібералізаваць грамадска-палітычную сітуацыю ў краіне, мы асноўным касцяком праваабаронцаў, якія складалі Праваабарончы цэнтр «Вясна», падалі дакументы на рэгістрацыю ў Мінюст у спадзяванні, што міністэрства выканае нашы законныя патрабаванні і адменіць наша незаконнае скасаванне хаця б вось такім чынам, зарэгістраваўшы Рэспубліканскую праваабарончую арганізацыю «Наша вясна» са змененай назвай, бо па заканадаўству, на жаль, мы не можам аднавіць нашу ранейшую назву, — адзначыў Алесь Бяляцкі. — Гэта будзе тэстам, праверкай на сапраўднасць жаданняў ці добрых інтэнцыяў беларускіх уладаў, наколькі яны гатовы пайсці на легалізацыю праваабаронцаў, бо дэ-факта ўсе разумеюць, што мы існуем, а дэ-юрэ яны нас загналі ў падполле, і з 2003 года мы працуем без законнай рэгістрацыі. Улічваючы, што ў беларускім заканадаўстве ёсць артыкул, які прадугледжвае крымінальную адказнасць за дзейнасць ад імя незарэгістраваных арганізацый (арт. 193 Крымінальнага кодэкса РБ — Г. К.), то, безумоўна, мы будзем дабівацца і скасавання гэтага артыкула. Нам патрэбна сістэмная лібералізацыя ў галіне свабоды асацыяцый, і рэгістрацыя «Нашай вясны» будзе праверкай існуючай сітуацыі».



## КАЛОНКА ЮРЫСТА

# ПРАВА НА ПРАЦУ



**Мы працягваем публікацыю адказаў вядомага юрыста і праваабаронцы Алега Волчака на пытанні людзей, якія звярнуліся ў грамадскай прыёмную.**

- *У нас на прадпрыемстве змянілі калектыўную дамову, у выніку адмянілі матэрыяльную дапамогу да адпачынку, матэрыяльную дапамогу пры нараджэнні дзіцяці працаўніка прадпрыемства, матэрыяльную дапамогу маладым, якія ўступілі ў шлюб першы раз, дапамогу працаўніку пры выхадзе на пенсію. Ці магу я скасаваць кантракт адразу пасля змянення калектыўнай дамовы, бо былі закрануты істотныя ўмовы працы?*
  *Варывончык Я. І., Пінск*

Паводле Працоўнага кодэкса, істотнымі ўмовамі працы прызнаюцца сістэмы і памеры аплаты працы, гарантыі, рэжым працы, разрад, найменне прафесіі, пасады, устанаўленне або адмена няпоўнага працоўнага часу, сумяшчэнне прафесій і іншыя ўмовы, усталяваныя ў адпаведнасці з дзейсным кодэксам.

Пры змяненні істотных умоў працы наймальнік абавязаны не пазней чым за месяц да ўвядзення новых умоў пісьмова паведаміць працаўніку (працаўнікам) пра змены. Пасля заканчэння месячнага тэрміна папярэджання, калі працаўнік не згодны, ён звальняецца паводле артыкула 35 Працоўнага кодэкса.

Калі ж наймальнік у аднабаковым парадку змяніў умовы, то працаўнік мае права звольніцца паводле артыкула 41 Працоўнага кодэкса ў сувязі з парушэннем наймальнікам заканадаўства аб працы, але факт парушэння павінен быць устаноўлены органам, які кантралюе, або судом. Таму ў дадзеным выпадку варта звярнуцца ў суд за звальненнем. Калі працаўнікоў загадзя не папярэдзілі, то дзейнічаюць ранейшыя ўмовы, і, пры невыкананні іх наймальнікам, вы маеце права таксама звярнуцца ў суд.

- *Ці мае права наймальнік не падоўжыць са мною кантракт і звольніць з працы, калі да пенсіі мне засталося дапрацаваць 5 гадоў (прэтэнзій па працы не маю)?*
  *Салаўёва С. С., Віцебск*

Паводле працоўнага заканадаўства, гарантыі па падаўжэнні кантракту дапушчаюцца ў адносінах да асоб, якія дасягнулі передпенсійнага ўзросту (жанчыны — 53 гады, мужчыны — 58 гадоў) пры ўмове добрасумленнага стаўлення да выканання працоўных абавязкаў. Іншых гарантый для асоб, што не дасягнулі згаданага веку, заканадаўства не ўтрымлівае. У дадзеным выпадку наймальнік не парушыў працоўнага заканадаўства, калі не падоўжыў кантракт на новы тэрмін.

- *Я працаваў на заводзе, у кастрычніку гэтага года без тлумачэння прычын са мной не працягнулі кантракт. Парушэнняў працоўнай дысцыпліны не было. Ці магу я абскардзіць рашэнне адміністрацыі заводу?*
  *Сідарэнка С. В., Мінск*

У адпаведнасці з артыкулам 242 Працоўнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, працаўнік мае права звяртацца ў суд па справах аб звальненні ў месячны тэрмін з моманту ўручэння працоўнай кніжкі або копіі загада аб звальненні. Калі тэрмін звароту прапушчаны, суд можа яго аднавіць. Пры разглядзе працоўных спрэчак судовыя выдаткі з працаўніка не спаганяюцца.

- *Як абараніць свае правы, калі чалавек працуе на кантрактнай аснове, а на працы яго ўвесь час прыніжае кіраўніцтва? Куды ў такім выпадку звяртацца?*
Галоўнага персанажа якраз і згуляў славуты акцёр Том Круз. Яго прызначэнне на гэтую ролю спачатку выклікала пратэсты сярод родзічаў сям'і Штаўфенберга. «Я баюся, што ён зробіць з бацькі звычайны кіч», — сказаў сын героя замаху 20 ліпеня. Праўда, потым, калі родныя нябожчыка пабачылі, як Том Круз працуе на здымках, яны змянілі сваё меркаванне. А пасля прэм'еры ўвогуле сказалі, што карціна ім спадабалася. Родзічы нават ігнаравалі відавочныя факты падману. Так, у адной з ключавых сцэнаў Штаўфенберг слухае «Палёт Валькірый» Вагнера. У рэальнасці Клаўс Штаўфенберг не выносіў музыкі Вагнера.

Не былі спачатку незадаволеныя ідэяй карціны і нямецкія ўлады: Круз вядомы як прыхільнік саенталогіі, якая ў Германіі лічыцца дэструктыўнай сектай. Пракат фільму з яго ўдзелам мог, на думку ўладаў, стаць прапагандай вучэння. Адзін з пратэстанцкіх пастараў палічыў, што выхад на экраны «Аперацыі «Валькірыя» з Томам Крузам для саентолагаў тое ж самае, што для нацыстаў Алімпійскія гульні ў Берліне ў 1936 годзе. У тым сэнсе, што прапагандысцкі эфект абедзвюх падзей будзе падобны.

Аднак потым кампраміс быў знойдзены, а кіношнікі нават атрымалі права здымаць ва ўрадавым квартале Берліна, дзе ў 1944-м адбываўся спачатку замах, а потым расправа над падпольшчыкамі. Улады таксама дазволілі выкарыстанне ў фільме свастыкі і іншых эмблем фашысцкай Германіі, якія забаронены да дэманстрацыі ў ФРГ. Цікава, што ўлады Берліна, якім не падабаліся дэкарацыі са свастыкай у цэнтры горада, падалі скаргу на вытворцаў карціны. Аднак гэта была дробязь у параўнанні з інцыдэнтам, які адбыўся ў жніўні 2007 года. Тады ўпала адна з дэкарацый, сур'ёзна параніўшы сем чалавек. Кінакампанія мусіла выплаціць больш за 11 мільёнаў долараў на іх лячэнне.

Акцёрскую гульню Круза палічылі нядрэннай. Аднак, паколькі рэжысёр карціны раней здымаў фільм пра прыгоды супермена, крытыкі заўважылі ва ўчынках Штаўфенберга некаторыя элементы паводзінаў героя амерыканскіх коміксаў. Як і супермен, Штаўфенберг вельмі добры канспіратар, які можа за хвіліну ператварацца ў супергероя.

Цікава, што паказны гераізм Штаўфенберга на экране выклікаў пазітыўную рэакцыю ў нямецкай праварадыкальнай прэсе. Вядучае правае выданне краіны «Unge Freihet» хваліць Тома Круза за тое, што ён змог стварыць тыпаж сапраўднага нямецкага афіцэра.

А вось расійскай публіцы, якая вырасла на савецкіх фільмах вайсковай патрыятычнай тэматыкі, гераізм Штаўфенберга падаўся фальшывым. Адзін з расійскіх крытыкаў назваў фільм «Маладой гвардыяй» па-галівудску.

Што да Круза, то ён паставіўся да ролі Штаўфенберга вельмі сур'ёзна. Настолькі, што падчас сцэны расстрэлу Штаўфенберга, якая здымалася на гістарычным месцы пакарання, прапанаваў ушанаваць памяць герояў падполля хвілінай маўчання.

22 студзеня фільм з'явіўся на экранах Германіі і выклікаў цікавую рэакцыю нямецкай публікі. Натуральна, усе гісторыкі папросту падалі ад смеху, назіраючы за прыгодамі Тома Круза. Акрамя агульнай фабулы, усё іншае часам папросту выдумка сцэнарыста. Так, на экране Штаўфенберг пры жаданні можа лёгка хадзіць да Гітлера ў госці.

Натуральна, больш за ўсё стваральнікі карціны і самі ўлады баяліся, што фільм стане прапагандай калі не нацызму, то нямецкага мілітарыстычнага духу.

Кіраўнік цэнтра памяці антыфашысцкага супраціву яшчэ напярэдадні рэлізу карціны выказаў занепакоенасць, што гэта створыць вакол Клаўса Штаўфенберга сапраўдны міф. Хаця, як сведчаць архіўныя дакументы, у прынцыпе ён быў дастаткова лаяльным да рэжыму і не заклікаў да радыкальнай трансфармацыі ў краіне пасля забойства Гітлера, тым больш у бок дэмакратыі.

Том Круз — заакіянскі акцёр — аказаўся вельмі зручным. Ён, як і большасць амерыканцаў, абсалютна не ведае традыцый юнкерства з іх фанатычным культам Германіі, расавымі забабонамі, арыстакратычным мысленнем. У выніку фільм больш прапагандуе рамантыку канспірацыі і партызанкі, чым нямецкага нацыяналізму.

Праўда, левая прэса ўсё роўна пабачыла ў «Аперацыі «Валькірыя» спробу рэабілітаваць Вермахт за злачынствы часоў другой сусветнай. Згадваецца, што шуміха вакол змовы 20 ліпеня пачалася ў 50-я гады, калі Бон вырашыў адрадзіць нямецкае войска. Для рэабілітацыі ў вачах ахвяраў нацызму пачаў мусіравацца міф пра тое, што салдаты не маюць нічога агульнага з гітлераўскай дыктатурай. Існаванне групы Штаўфенберга было важным аргументам у доказ гэтага тэзісу.

Левыя публіцысты нагадваюць, што Гітлера дапусціў да ўлады менавіта Гіндэнбург — славуты генерал, кумір усіх нямецкіх афіцэраў. Адным з галоўных матываў, які рухаў удзельнікамі групы 20 ліпеня, было абвінавачанне Гітлера ў «дылетантызме», у тым, што ён не ведае, як весці вайну, не слухае прафесіяналаў-вайскоўцаў. Таму, на думку левых, «Аперацыя «Валькірыя» дастаткова небяспечны фільм, які спрыяе перагляду вынікаў другой сусветнай.

Аднак большасць публікі не ведае так добра гісторыі і не здолее разабрацца ў такіх тонкіх момантах. Перш за ўсё гэта прыгодніцкі фільм пра добрых падпольшчыкаў, якія змагаюцца з кепскім дыктатарам. Папулярны часопіс «Stern» нават рэкамендаваў хадзіць на фільм усёй сям'ёй. Думаецца, фільм будзе штурхаць на нейкія палітычныя развагі не больш, чым «Тэрмінатар» або «Шрэк».

Праўда, расслабляцца гісторыкам не трэба. «Аперацыя «Валькірыя» — гэта толькі кветачкі. Ягадкі будуць, калі вясной на экраны выйдзе новы фільм Квенціна Таранціна «Невядомыя падонкі». У аснове яго сюжэта аповед пра групу закінутых у нямецкі тыл амерыканскіх дыверсантаў, што жорстка знішчае эліту Трэцяга Рэйху. Крыві, гвалту і іншых характэрных для Таранціна прыёмаў у фільме будзе, як заўсёды, зашмат. Гісторыкі, якія чыталі сцэнар, кажуць, што большай антыгістарычнай лухты яны яшчэ не бачылі.

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### БРАЗІЛІЯ. АНЁЛ СМЕРЦІ ВЫКАНАЎ АБЯЦАННЕ ГІТЛЕРУ

Йозэф Менгель, доктар нацысцкага канцлагера Асвенцім, здаецца, рэалізаваў мэту жыцця — зразумеў прычыну феномену нараджэння блізнюкоў і нават рэалізаваў яго на практыцы. Пра гэта піша Хорхэ Камараса — аргенцінскі гісторык, аўтар новай кнігі «Анёл смерці ў Паўднёвай Амерыцы», прысвечанай гісторыі жыцця Менгеля ў эміграцыі. Адкрыць формулу нараджэння блізнюкоў Йозэф Менгель асабіста абяцаў Гітлеру, які марыў засяліць германскай расай увесь свет, што патрабавала высокай нараджальнасці. Свае эксперыменты вучоны ставіў над палоннымі ў Асвенціме, за што атрымаў прозвішча «Анёл смерці». Аднак у выніку закончыць свае доследы ён не паспеў: у 1945 годзе, не чакаючы прыходу Чырвонай арміі, ён збег у Лацінскую Амерыку, дзе пад чужым прозвішчам жыў да самай смерці ў 1979 годзе. Яго асноўным месцам пражывання была нямецкая калонія ва Уругваі, адкуль ён часта ездзіў у бразільскі горад Кандыда Гадой, дзе працаваў як доктар. Парадокс у тым, што зараз у Кандыда Гадой кожная пятая цяжарнасць заканчваецца нараджэннем блізнюкоў, прычым часта бландзінаў і з блакітнымі вачыма. Паколькі, як згадваюць сучаснікі, Менгель часта дапамагаў цяжарным, а феномен з блізнюкамі ўпершыню зафіксаваны ў 1963 годзе, якраз тады тут з'явіўся Менгель, гісторык зрабіў выснову, што без «Анёла смерці» тут не абышлося.

### ІТАЛІЯ. ЖОНКА САРКАЗІ ДАПАМАГАЕ ТЭРАРЫСТАМ?

Бразільскі ўрад вырашыў надаць статус палітычнага ўцекача былой грамадзянцы Італіі Чэзарэ Батыста. Чэзарэ Батыста — былая сяброўка левай тэрарыстычнай групоўкі «Чырвоныя брыгады» і, як лічаць у італьянскай пракуратуры, нясе адказнасць за чатыры забойства. Аднак куды больш гнеў афіцыйнага Рыма выклікае роля, якую адыграла ў гэтай гісторыі Карла Бруні, цяперашняя жонка прэзідэнта Францыі Нікаля Сарказі. Саюз ахвяраў тэрарыстаў абвінавачваў яе ў тым, што яна дапамагла Чэзарэ пакінуць Францыю, дзе тая хавалася з пачатку 80-х гадоў ад італьянскіх уладаў, і атрымаць прытулак у Бразіліі. Сябры саюза кажуць, што маюць запісы прыватнай размовы мадам Сарказі і бразільскага прэзідэнта Лулы на гэты конт. Тое, што якраз Карла была ініцыятарам размовы, не выклікае ў грамадскасці ніякіх сумневаў. Бруні, у адрозненні ад мужа, сімпатызуе левым і раней дабілася, каб Францыя адмовіла Італіі ў экстрадыцыі другога актывіста «Чырвоных брыгад». Сама Карла кажа, што яна чуе пра нейкую Чэзарэ Батыста першы раз у жыцці.

### ТУРЦЫЯ. САТЫРЫКУ ВЯРНУЛІ ГРАМАДЗЯНСТВА

Назім Хікмет, выбітны турэцкі пісьменнік, сатырык і паэт, зноў стаў грамадзянінам Турцыі. Рашэнне пра гэта прыняў турэцкі ўрад. Грамадзянства ён быў пазбаўлены ў 1951 годзе, калі вызваліўся з турмы і выехаў у Савецкі Саюз. СССР ахвотна прыняў уцекача, тым больш, што Назім быў сябрам турэцкай Кампартыі. У палітычнай эміграцыі Назім напісаў шмат кніг, якія прынеслі яму сусветную славу, хаця доўгі час яны былі забароненыя ў Турцыі. Памёр пісьменнік у 1963 годзе ў Маскве. Цікава, што нягледзячы на свае камуністычныя погляды, ён падтрымаў Хрушчова ў барацьбе супраць культу Сталіна. Магчыма, Назіма вельмі ўразіў выпадак, які адбыўся, калі ён толькі прыехаў у Саюз. На пытанне: «З кім з савецкіх пісьменнікаў ён бы хацеў сустрэцца?» Назім Хікмет адказаў: «Міхаіл Зошчанка». Між тым, якраз на пачатку 50-х гадоў Міхаіл Зошчанка і Марына Цвятаева сталі ахвярамі ждануўскай кампаніі і лічыліся амаль дысідэнтамі.

ЭПІДЭМІЯ

# ХАЛЕРА ШУКАЕ НОВЫЯ АХВЯРЫ

Алег НОВІКАЎ

**Больш за 2 тысячы чалавек ужо памерла ў выніку выбуху эпідэміі халеры ў Зімбабве. Яшчэ сорак тысяч ляжаць у бальніцах. І гэта толькі пачатак.**



Сітуацыя ў Зімбабве падаецца незвычайнай. Па-першае, здавалася, часы, калі эпідэміі халеры праносіліся па свету, знішчаючы цэлыя рэгіёны, даўно прайшлі. Халера, нагадаем, гэта вострая інфекцыйная хвароба. З-за яе праяў хворы хутка губляе вадкасць. Каб чалавек памёр, часам дастаткова аднаго дня.

Лічыцца, што першымі ахвярамі хваробы сталі жыхары Індыі, дзе спякотны трапічны клімат садзейнічае сінтэзу розных відаў бактэрый. З берагоў Ганга зараза пайшла гуляць па свеце ў форме так званых пандэмій.

У 1821 годзе адбылася першая пандэмія. Яе ахвярамі сталі больш за сто тысяч чалавек у Кітаі. 1829 год — другая пандэмія. Ахвяры — сто тысяч чалавек у Францыі і Аўстрыі. 1849 год — трэцяя пандэмія. Ахвяры — больш за мільён чалавек у Расіі. 1863 год — чацвёртая пандэмія. Ахвяры — 150 тысяч чалавек у Германіі. 1881 год — пятая пандэмія. Ахвяры — 260 тысяч чалавек у Расіі, 150 тысяч у Іспаніі. Гэта была апошняя пандэмія, якая дасягнула Еўропы. На той час славуты Роберт Кох знайшоў узбуджальніка хваробы — бактэрыю vibrio cholerae, а ўрады Еўропы пачалі фінансаваць сістэму публічнай аховы здароўя. Еўропы, але не Расіі... Пандэмія 1899 года ўсталявала жудасны рэкорд: за першае дзесяцігоддзе XX стагоддзя ў Расіі ад халеры памерла паўмільёна чалавек. Пасля рэвалюцыі сітуацыя значна палепшылася, аднак пандэмія 1964 года не абышла поўдзень СССР. Пандэмія 60-х гадоў была апошняй.

Усяго за XIX стагоддзе халера забіла 23 мільёна чалавек. Сярод іх два мільёна — грамадзяне Расійскай імперыі. У спісе славутых ахвяр халеры Міцкевіч, Чайкоўскі, Гегель, Джэймс Порк — прэзідэнт ЗША.

Аднак тыя змрочныя часы даўно прайшлі: цяперашнія лекі дастаткова эфектыўныя, каб ставіць на ногі 999 з 1000 хворых.

Па-другое, у Зімбабве, якой ужо дваццаць гадоў кіруе Роберт Мугабэ, пануе дыктатарскі рэжым, што, тэарэтычна, павінна было б дазволіць уладам без усякіх нарматыўных працэдур мабілізаваць патрэбны дзяржаўны рэсурс і хутка праводзіць санітарныя меры. У якасці прыкладу можна згадаць, як змагаліся з халерай у СССР. У 1971 годзе халеру выявілі ў Адэсе. Горад напросту зачынілі. Усіх курортнікаў, якіх было каля ста тысяч, разбілі на дзесяткі. Калі ў кагосьці былі праблемы са здароўем, усіх клалі ў шпіталь. Кожны вечар дружыннікі абыходзілі кватэры, шукаючы тых, у каго пачалася дыярэя — адзін з асноўных сімптомаў халеры.

Аднак абодва фактары не спрацавалі з-за адной прычыны: Зімбабве — гэта тыповая краіна ў стане заняпаду. За гады дыктатуры ў краіне была зруйнавана ўся інфраструктура. Нават чыстая вада — цяпер дэфіцыт. Міністр абароны здароўя прызнае, што без вонкавай дапамогі Зімбабве не ў стане перамагчы vibrio cholerae.

Акрамя таго дыктатарскі рэжым баіцца публічна прызнаваць свае памылкі. Калі ў снежні з'явілася халера, улады ўпарта маўчалі. Потым нечакана Роберт Мугабэ з'явіўся на экранах, каб павіншаваць суайчыннікаў з перамогай над халерай. У той жа дзень у сталіцы адной з правінцый памерла 30 чалавек. Калі схаваць факт эпідэміі было ўжо немагчыма, Мугабэ заявіў, што вірус — біялагічная зброя падступнага Захаду, які праз халеру хоча скінуць ягоны самы народны рэжым на планеце. Сітуацыя даходзіць да камічнага. Міністр інфармацыі сабраў нараду супрацоўнікаў дзяржаўных СМІ і патрабаваў мінімізаваць маштабы хваробы, каб «не даць падставу ворагам прэзідэнта для атак на яго».

Найбольш катастрафічная сітуацыя ў прыгарадах. Тут поўная антысанітарыя, і хвароба распаўсюджваецца рэкордными тэмпамі. Жыхарам сталіцы пашанцавала больш. Белыя каланізатары, якія кіравалі краем да пачатку 80-х, вельмі любілі купацца ў басейнах, якія звычайна будавалі ва ўнутраных дворыках. Гэтыя басейны сёння выратавалі жыццё тысячам людзей: у іх можна трымаць чыстую ваду, якую потым ужываць без рызыкі для здароўя. Водаправод і каналізацыя даўно ўжо ў Харарэ не працуюць. Чыстая вада зараз самае вялікае раскоша для жыхароў краіны. Якраз дрэнная якасць вады, якую спажываюць у прыгарадах, стала прычынай хуткага пашырэння эпідэміі (часам людзі тут пілі ваду нават з лужын).

Згаданая вышэй лічба ахвяр — гэта дадзеныя афіцыяльнай статыстыкі. На самай справе, як піша прэса, колькасць нябожчыкаў — дзесяткі тысяч. Сістэма аказання медыцынскай дапамогі ў шматлікіх вёсках папросту адсутнічае, з правінцыяй часам няма нават тэлефоннай сувязі. Адказны ў Чырвоным Крыжы за сітуацыю з халерай у Зімбабве баіцца, што атручаная вада з гарадоў можа трапіць на палі фермераў. У такім выпадку вірус трапіць у ежу.

Уся Афрыка ў паніцы. Час інкубацыі — ад заражэння да яўнага праяўлення праяў хваробы — складае тры дні. Гэтага дастаткова, каб які-небудзь чалавек у яшчэ знешне здаровым стане пакінуў краіну і дабраўся да суседняй Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікі (ПАР) або Мазамбіку, заразіў там людзей і толькі потым апынуўся ў шпіталі. Усе краіны — суседзі Зімбабве — ужо абвясцілі ў сябе стан трывогі на выпадак імпарту халеры.

Пакуль галоўным адказам на пагрозу пашырэння эпідэміі стаў выраб вялікіх, на 75 тысяч літраў, цыстэрнаў у раёнах, дзе пануе хваробы. Плануецца, што чыстая вада, якая будзе там утрымліваца і раздавацца насельніцтву, прытармозіць эпідэмію.

Аднак гэта не панацэя. Фактычная ізаляцыя Зімбабве, якую пачынаюць суседзі, значыць смяротны прысуд для яе грамадзян. У самой краіне даўно ўжо няма ніякай вытворчасці. Інфляцыя б'е сусветныя рэкорды. Кошты ў крамах пераглядаюцца кожную гадзіну. Жыхары краіны раней выжывалі за кошт працоўнай міграцыі або спекуляцый імпартнымі таварамі. Цяпер толькі вар'ят з-за мяжы будзе працаваць на зімбабвійскім рынку.

Прадстаўнік Сусветнай арганізацыі аховы здароўя бачыць будучыню Зімбабве так: «У бліжэйшы час колькасць хворых будзе ўдвая большай. Тыя, хто выжывуць, усё роўна памруць. З-за рэжыму ізаляцыі краіне пагражае праблема з прадуктамі харчавання, а людзі, якія ўжываюць мала ежы, звычайна становяцца ахвярамі малярыі або грыпу».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### БАРЫС ГРЫЗЛОЎ



Супрацоўнікі дэпартаменту аналітычнага кіравання Дзяржаўнай думы Расіі, старшынёй якой з'яўляецца Барыс Грызлоў, правялі ўласнае даследаванне масавых пратэстаў на Далёкім Усходзе. У пачатку студзеня ў некаторых гарадах рэгіёна людзі ў масавым парадку выходзілі на вуліцы, пратэстуючы супраць новага закону аб пошлінах на іншаземныя маркі аўтамабіляў. Цяпер набыць патрыманую «Хонду» або «Мазду» звычайнаму расіяніну будзе відавочна не па кішэні. Адсюль і матыў пратэстаў. Аднак аналітыкі з Дзяржрдумы знайшлі сапраўдных арганізатараў беспарадкаў. Такім чынам, як гаворыцца ў дакладной запісцы, за бунтамі стаялі... японскія самураі. Японцы даўно паклалі вока на гэту частка Расіі. Як толькі ў РФ пачаўся крызіс, у Токіо вырашалі, што лепшага шанцу для дэстабілізацыі сітуацыі, каб адарваць рэгіён ад Масквы, ужо доўга не будзе. Пра руку Токіо, на думку аўтараў дакладной запіскі, гаворыць прысутнасць на адным з мітынгаў японскага сцягу. Тэзіс абсалютна дзіўны. Дастаткова сказаць, што секцыя «Адзінай Расіі» Уладзівастока падтрымала акцыі аўтамабілістаў. Апазіцыйныя аналітыкі пракаментавалі дакумент як спробу назваць «шпіёнамі» ўдзельнікаў любых сацыяльных пратэстаў, маштаб якіх, думаецца, хутка будзе толькі ўзрастаць. Цікавы яшчэ адзін аспект афіцыйнай трактоўкі падзей на Далёкім Усходзе. Цэнтральная прапаганда мэтанакіравана супрацьстаўляла гэты край іншым рэгіёнамі Расіі. Такім чынам, Масква ўпершыню намагаецца сутыкнуць рэгіёны, каб адвесці ад сябе абвінавачанні ў крызіснай сітуацыі.

### ЛУІС САПАТЭРА



Падпарадкаванае прэм'еру Міністэрства ўнутраных спраў правяло паспяховую аперацыю супраць прыхільнікаў незалежнасці Краіны баскаў. У ноч на 24 студзеня прадстаўнікі МУС арыштавалі дзесяткі чалавек. Афіцыйная падстава арыштаў — спроба адрадзіць раней забароненую партыю Батасуна («Адзінства»), якая была пазбаўлена рэгістрацыі за кантакты з тэрарыстамі радыкальнай нацыяналістычнай групоўкі ЕТА. Сапраўдная прычына рэпрэсій — спроба нацыяналістаў сабраць подпісы за стварэнне аб'яднання, каб прыняць удзел у выбарах у парламент баскскай аўтаноміі, прызначаных на 1 сакавіка. Нацыяналісты надумалі стварыць дазволеную законам так званую «выбарчую платформу» — асацыяцыю грамадзян, якія выстаўляюць на выбарах сваіх кандыдатаў. Платформа павінна была называцца «Дэмакратыя для трох мільёнаў» (насельніцтва Краіны баскаў складае менавіта тры мільёна чалавек). Навіна пра стварэнне ініцыятывы выклікала перапалох у Мадрыдзе. Калі «патрыятычная левая» (так называюць тут баскскіх нацыяналістаў) зможа ўдзельнічаць у выбарах, партыі, якія сімпатызуюць ідэі незалежнасці краю, могуць застацца ў большасці ў парламенце аўтаноміі і далей псаваць настрой Мадрыду сваімі праектамі, кшталту атрымання баскамі статусу асацыяванай з Іспаніяй дзяржавы. Таму зараз пракуратура і МУС намагаюцца ўсімі сродкамі знайсці падставы для забароны платформы. Аднachасова нацыяналісты працягваюць збор подпісаў, патрэбных для рэгістрацыі аб'яднання.

### КІМ ЧЭН ІР



Вялікі правадыр Паўночнай Карэі заклікаў працоўных і сялян да барацьбы з сусветным эканамічным крызісам шляхам падрыхтоўкі да вясенніх палявых мерапрыемстваў. Сэнс кампаніі — сабраць як мага больш угнаенняў і вывезці іх на палі. Раней большасць угнаенняў імпартавалася ў краіну з Паўднёвай Карэі. Аднак цяпер гэтай ганебнай практыцы пакладзены канец. Да барацьбы за ўраджай падключаны таксама і жыхары сталіцы. Ім прапанавана збіраць рачны іл. Штодня кожны працоўны калектыў пасля працы ідзе не да хаты, а выходзіць на замацаваны за ім участак ракі, якая працякае праз Пхеньян. Узброеныя кіркамі, лапатамі, пад акампанемент духавых аркестраў, мужчыны сыходзяць на дно ракі, якая абмялела ўзімку. Працоўныя выкопваюць вялікія кавалкі ілу, якія жанчыны пераносяць у грузавікі. Пасля чаго, адпаведна дзяржаўнай прапагандзе, угнаенні даставяць у сельскія кааператывы і забяспечаць фенаменальны прамысловы скачок у гэтым годзе. Баі за новы ўраджай прынялі апошнімі днямі нацыянальны маштаб. На думку замежных журналістаў, у барацьбе за ўгнаенні ўдзельнічае большая частка працаздольнага насельніцтва КНДР. «Чым больш гною, тым больш рысу», — аўтарытэтна заявіў любімы кіраўнік таварыш Кім Чэн Ір.

▸ З НЕВЯДОМАГА

**У мінулым годзе ў «Новым Часе» друкавалася серыя нарысаў Сяргея Гваздзёва, прысвечаная малавядомым мастакам Заходняй Беларусі — па большасці гадаванцам факультэта выяўленчага мастацтва універсітэта імя Стэфана Баторыя. Але гэтымі творцамі не абмяжоўваецца беларускае прафесійнае мастацтва на землях, якія ў 1921–1939 гадах належалі Польшчы. Працяг тэмы — у новым нарысе.**

# ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ПЛЫНЬ

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**Дэфіцыт праўды, падзел грамадства, у тым ліку творцаў, на «нашых» і «не нашых» — адно з наступстваў панавання савецкага таталітарнага рэжыму. Гісторыя беларускага мастацтва блізкага нам XX стагоддзя не з'яўляецца выключэннем.**



М. Дабужынскі. Віцебск. Акварэль.



А. Лазіцкі. За камышом.

## «Нашы» і «не нашы»

Што ж азначае гэта своеасаблівая формула амаль сакральнага прысабечвання «нашы»? Ці наш «руска-літоўскі мастак» Мсціслаў Дабужынскі, які выдатна аздобіў фундаментальную працу Вацлава Ластоўскага «Гісторыя крэўскай (беларускай) кнігі» і супрацоўнічаў з часопісам «Крывіч»? Ці наш, запісаны ва універсітэцкіх дакументах як паляк, буйнейшы графік заходнебеларускага друку Язэп Горыд? Ці наш літовец Уладас Дрэма, які ілюстраваў беларускія выданні? Ці нашы палякі Ежы Гапен і Фердынанд Рушчыц, якія, апрача неацэннай уласнай мастацкай творчасці, зрабілі для развіцця беларускай культуры больш за іншыя інстытуцыі?

Упэўнены: усе яны — нашы! Супраціў мастацтва таталітарнаму ціску мацней, чым палітычны, што ніяк не могуць зразумець дыктатары ўсіх часоў і народаў. І таму так важна ажывіць памяць, вярнуць з нябыту спадчыну выбітных творцаў. І па меры аднаўлення мы ўбачым, як на даляглядзе мінулага паступова праступае цэлае сузор'е слаўных імёнаў, свет творчасці якіх не саслабеў да гэтага часу.

Ужо з таго, што нам адкрылася, відавочна зманлівым падаецца меркаванне, што «за палякамі» адсутнічала «мастацкая школа». Сапраўды, у Заходняй Беларусі не было нацыянальнай мастацкай школы. Але наколькі нацыянальнымі можна лічыць (асабліва ад 30-х гадоў, пасля ўдушэння беларусізацыі) адмысловыя мастацкія ўстановы ў Савецкай Беларусі? Гэта пытанне не ўздымалася ніводнага разу.

Сцвярджэнні ж кшталту: «З прычыны сацыяльнага і нацыянальнага ўціску вучыцца беларусу пры палякаў было папросту немажліва», — увогуле не вытрымліваюць аніякай крытыкі. Гэта калі не свядомая мана, дык «добра прадуманая недакладнасць», што набыла ўстойлівасць догмы.

## Школа

І ў гэтай, і ў папярэдніх публікацыях, я імкнуўся непрадузята прааналізаваць факты і на іх аснове давесці, што і «за польскім часам» у Беларусі існавала шырокая мастацкая плынь з натуральна ўласцівымі ёй вірамі, быстрынамі і водмелямі. Пакуль што заўчасна называць сукупнасць фактаў прафесійнага выяўленчага мастацтва «заходнебеларускай мастацкай школай». Больш дакладным уяўляецца менавіта вызначэнне «шырокая мастацкая плынь». Не выпадкова пасля ўключэння Заходняй Беларусі ў склад БССР узнікла ідэя стварэння Саюза мастакоў Заходняй Беларусі. Зразумела, што ўлады найперш кіраваліся ідэалагічнымі чыннікамі, але ж быў і рэальны мастацкі рэсурс. Юрыдычнае афармленне адпаведнай структуры мусіла адбыцца на грунце мастакоў Беласточчыны, пра што згадвалі мастакі Пётр Паўлючук і Яўген Ціхановіч, пацвярджаюць гэта і іншыя крыніцы.

Безумоўна, галоўную ролю ў фармаванні корпуса мастакоў Заходняй Беларусі адыгрывала Вільня, гістарычная сталіца ВКЛ, з адроджаным у ёй у 1919 годзе універсітэтам. У Вільні мастацтву вучыліся каля 40 беларусаў. Была яшчэ і Варшаўская вышэйшая школа мастацтваў, заснаваная ў 1904 годзе намаганнямі гурту энтузіястаў на чале з мастаком і музейшчыкам з Навагрудчыны Стаброўскім, які і стаў яе першым дырэктарам. У склад заснавальнікаў уваходзіў таксама Фердынанд Рушчыц. Гэта школа прытуліла каля 20 «выхадцаў з Крэсаў». Сярод навучэнцаў і вольных слухачоў Варшаўскай школы — каталікі Стэфан Пупко і Мар'ян Фаберкевіч, праваслаўныя Алесь Анкудовіч, Зміцер Дунаеўскі, Яўген Федарчук, Мікола Пашун, Яўген Паляшчук, Пётр Паўлючук і інш.

Шмат выхадцаў з Заходняй Беларусі здабывалі майстэрства ў славутай сваім гістарычным ды рэлігійным жывапісам, моцнай класічнай традыцыяй Кракаўскай акадэміі мастацтваў. Вось некаторыя з імёнаў студэнтаў, чыё паходжанне ўдалося ўстанавіць: А.Чачот (1898 г.н.) — з Навагрудка, У. Канстанцінаў (1906 г.н.), К. Карповіч, З. Канановіч, К. Сідаровіч — з Пінску, Ф. Пекарскі — са Слоніма і яшчэ больш за трыццаць чалавек. Усе — з беларускіх гарадоў і мястэчак, якія, мяркуючы па прозвішчах, былі спадчыннікамі землях былога ВКЛ — «ліцвінамі», беларусамі-каталікамі, або «краёвымі», этнічнымі, апалячанымі беларусамі.

Поруч з дзяржаўнымі акадэміямі мастацтваў у тыя часы ў Еўропе існавала пашыраная практыка навучання ў «прыватных школах». Далёка не заўсёды ў прафесараў вялася дакументацыя, яшчэ менш папераў захавалася да нашых дзён. Даводзіцца даць веры меркаванню крытыка і даследчыка гісторыі мастацтваў Уладзіміра Глыбіннага, што адзін з цікавейшых і перспектыўных мастакоў Заходняй Беларусі Алесь Трайковіч навучаўся ў адной з такіх кракаўскіх школ (1938–1940). Ёсць сведчанні (не пацверджаныя пакуль дакументальна), што ў Кракаве навучаўся і мастак са Слоніму Антон Карніцкі.

Беларусы з паўднёва-заходняй часткі краю імкнуліся навучацца ў мастацкіх установах Львова, дзе ў 30-я гады быў значны цэнтр сакральнага мастацтва. Нямала беларусаў навучалася і ў іншых мастацкіх установах Еўропы.

Гэта ўсё былі вышэйшыя навучальныя мастацкія ўстановы, куды паступалі людзі, якія ўжо амаль вызначыліся з выбарам свайго шляху. Аднак тут неабходна адзначыць уплыў на фарміраванне той самай заходнебеларускай мастацкай плыні, пра якую вядзем размову, народных промыслаў. І трэба звярнуць асаблівую ўвагу на гурткі малявання ва ўсіх гімназіях, дзе асновы выяўленчай граматы закладаў мастак-прафесіянал.



А. Лазіцкі . Стары ў брылі.

Узгадаем, да прыкладу, што самабытны творца Язэп Драздовіч адзін час кіраваў гуртком малявання пры Віленскай беларускай гімназіі, з якога пачаўся шлях у вялікае мастацтва будучых выбітных майстраў — графікаў Васіля Сідаровіча, Міколы Васілеўскага, жывапісца Рамана Семашкевіча.

Па сутнасці гурткі пры гімназіях уяўлялі сабой цэласную сістэму пошуку, заахвочвання і першапачатковай мастацкай адукацыі таленавітай моладзі. Пра гэта захаваліся яскравыя сведчанні ў публікацыях беларускага грамадскага дзеяча, журналіста Алеся Чэмера (Аляксея Анішчыка), у матэрыялах Клецкай беларускай гімназіі, з якой выйшаў Зміцер Чайкоўскі. У сваіх «Успамінах» графік Сямён Геруса ўзгадвае выкладчыка малявання з Навагрудку Афанасьева, які ў 1938 годзе з'ехаў у Парыж, распавядае пра пленэры, на якіх многія з мастакоў «паміж сабой і з месцічамі гаварылі па-беларуску».

Зразумела, па-рознаму склаліся лёсы навучэнцаў. Да прыкладу, Пётр Сергіевіч пасля непрацяглага навучання ў Кракаве вярнуўся ў Вільню, а дойлід Рафаіл Яўхімовіч рушыў вучыцца ў Парыж, ураджэнец Тракенікаў, мастак, педагог і даследчык Мар'ян Шышка-Богуш трапіў у 1939 годзе ў палон, потым — у войска Андэрса, а з 1947 года жыў у Лондане. У часы другой сусветнай вайны загінуў у канцэнтра-

цыйным лагеры скульптар Язэп Жукоўскі.

## Пінская кагорта

Ідучы па слядах мастакоў віленскай школы, я раз-пораз натыкаўся і на след мастакоў з іншых мясцін Заходняй Беларусі. І перада мной паступова адкрывалася, набывала дастаткова ясны і канкрэтны выгляд шырокая плынь заходнебеларускага мастацтва. Прычым у гэтай плыні пачалі праступаць контуры асобных і своеасаблівых мастацкіх калі не школ, то асяродкаў.

Менавіта ў Кракаве ўпершыню я пачуў імя мастака Аляксандра Лазіцкага, што быў родам з Пінску. А па яго слядах выйшаў на творчую мастацкую арцель, якая атабарылася ў палескім гарадку.

Пасля 1921 года ў гэтым своеасаблівым Заходнебеларускім Канстанцінопалі, вакол Палескіх кірмашоў, якія ад 1936 года набылі рэгулярны характар, без маніфестаў і пісьмовых дэкларацыяў утварыўся этнічна стракаты, па большасці з беглых ад рэвалюцыі мастакоў (як прафесійных, так і самавукаў), творчы асяродак. Гэткі, сучаснай мовай кажучы, часовы творчы калектыў, у склад якога поруч з Лазіцкім, уваходзілі Фёдар Лаўроў, Іван Дзіміч, Сяргей Муханаў, Павел Петразаводскі, Арсень Заяц, Яўген Пулхаў, Яўген Піскун. Раз-пораз бралі ўдзел у хаўрусе дойлід з Кобрына Бальбіна Свіціч-Відацка, мастакі-пейзажысты Вандалкоўскі і Райкоўскі.

У функцыі суполкі ўваходзіла праектаванне, мастацкае рашэнне і практычнае ўвасабленне адмысловага выставачнага павільёна на беразе Піны, выкананне тэатральных строяў і дэкарацыяў для тэатральных імпрэзаў і г. д. Кожны з удзельнікаў калектыву не забываўся на творчасць і выстаўляў свае творы на мастацкіх выставах кірмашоў.

З задавальненнем і ўдзячнасцю звернемся да матэрыялаў, якія расшукалі краязнаўца Раіса Марголіна і гісторыкі, аўтары выдання «Гістарычная Брама» Аляксандр Ільін і Эдуард Злобін, каб хоць эскізна абмаляваць лёсы і спадчыну пінскіх мастакоў.


Іван Дзіміч з сынам. 30-я гады XX ст.


Арсень Заяц

**Лаўроў Фёдар Філіпавіч** (1896–1971). Прыехаў у Пінск ужо ў адносна сталым веку пасля падпісання рыжскай дамовы, калі сям’я ратавалася ўцёкамі ад рэвалюцыі. Па сведчанні Брэсцкага абласнога архіва, «служыў харунжым у войску генерала Б. С. Перамыкіна», якое з 1920 года фармавалася ў Польшчы для змагання з бальшавікамі. Па заканчэнні Вышэйшай мастацкай школы ў Варшаве працаваў досыць плённа — маляваў алеем, займаўся аб’ёмнай скульптурай, разьбой па дрэве, металапластыкай. У 1936 годзе ачоліў пінскую мастацкую арцель. Разам са Зміцерам Геаргіеўскім распрацаваў і выканаў мастацкае аздабленне першай, адкрытай 5 красавіка 1936 года, экспазіцыі Палескага музея. В. Лабачэўская сведчыць: «Усю работу яны выканалі без ніякай аплаты. Сучаснікі ж адзначалі, што музей пакідаў добрае ўражанне». Фёдар Лаўроў спраектаваў і зрабіў вітражы для праваслаўнай святыні — Фёдараўскага сабора. Увасобіў у матэрыяле (бетоне) скульптурную кампазіцыю «Паляшук», якая стала сімвалам штогадовых Палескіх кірмашоў. З кастрычніка 1939 года працаваў кіраўніком студыі выяўленчага мастацтва Дома піянераў. У 1941 годзе быў асуджаны па 58-м артыкуле і адпраўлены ў савецкі канцэнтрацыйны лагер. З лістапада 1944 года кіраваў майстэрняй мастацкіх промыслаў у «Вятлагу».

**Дзіміч Іван Георгіевіч** ( 1879–1940?). У Пінск патрапіў у 1890 годзе, калі яго бацька ўзначаліў аддзел шляхоў зносінаў Брэст-Літоўскай чыгункі. Меў мастацкую адукацыю. У снежні 1926 года на прамысловай выставе экспанаваліся яго творы, у 1927 годзе ён стварыў заслону ў Пінскай дзяржаўнай мужчынскай гімназіі. Браў удзел у выставе падчас I Палескага кірмашу. На кірмашы 1936 года паказаў больш за дзесятак сваіх твораў. Тагачасныя крытыка асабліва вылучала краявіды «Палескія паплавы» і «Хата рыбака ля Пінска», адзначала ў творчасці мастака подых «сучаснага імпрэсіянізму». У 1939 годзе паспеў выдаць нізку з шасці паштовак. На дзвюх з іх быў адлюстраваны Пінскі езуіцкі кляштар, на іншых — гарадскія краявіды, вясковая хата, палескі поплаў. У 1940 годзе быў арыштаваны органамі НКУС і разам з сынам і жонкай, Наталляй Генрыхаўнай, сасланы. Гэта апошняе, што вядома пра яго.

**Петразаводскі Павел Мікалаевіч** (1893–1940?) — ваяр паўстанцкай арміі Булак-Балаховіча. Займаўся разьбой па дрэве. Жыццёвы і творчы шлях яго вядомы па нешматлікіх публікацыях у тагачасным перыядычным друку. На I Палескім кірмашы П. Петразаводскі выставіў шматлікія скульптуры, барэльефы, творы дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, пластыку, мастацкую фатаграфію. Журналісты адзначалі сімвалічны характар яго твораў. Скульптурную кампазіцыю «Паляшук» першапачаткова ён стварыў з дрэва, а потым ужо Лаўроў перавёў яе ў бетон. Не цураўся П. Петразаводскі і грамадскай дзейнасці. У 1940 годзе ў палескім музеі была створана экспазіцыя гістарычнага аддзела, у якой экспанавалася вялізнае пано Петразаводскага на тэму «ўз’яднання», якое было выканана ў тэхніцы інтарсіі і разьбы па дрэве. Далейшы лёс былога балахоўца пры новых уладах невядомы, але, здаецца, зразумелы.

**Муханаў Сяргей Эмануілавіч** (1915–?). Ён хаця і не нарадзіўся ў Пінску, але з маладосці быў паяднаны з гэтым горадам. Тут ён, прадаўжальнік роду бунтара з Сенацкай плошчы і ўнук старшыні Дырэкцыі імператарскіх тэатраў у Варшаве С. С. Муханава, закончыў польскую гімназію. Тут быў на службе ў архіепіскапа Аляксандра, які ад 1935 года фундаваў яго навучэнне ў Кракаўскай акадэміі мастацтва. Тут падчас летніх вакацый працаваў у мастацкай арцелі. У выніку геапалітычных землятрусаў 40-х апынуўся ў Баварыі. У 1947 годзе назаўжды пакінуў Еўропу. Жыў у Каліфорніі, працаваў мастаком на кінастудыях Галівуда.

**Заяц Арсень Фядосавіч** (1905–1995). Ён не быў сталым удзельнікам мастакоўскага хаўрусу, бо жыў у Францыі, куды закінулі яго віхуры войнаў і каламуць рэвалюцыяў. У родны Пінск у міжваеннае дваццацігоддзе наязджаў эпізадычна, на адведкі бацькоў і сваякоў. Рабіў замалёўкі, каб потым вобразы гэтыя перанесці на лінолеум. Верасень 1939 года заспеў яго ў Пінску. З акупаванай Польшчы ўдалося выбрацца. У нямецкі канцэнтрацыйны лагер трапіў ужо ў Францыі, але і там не расставаўся з алоўкам. Па вайне досыць паспяхова займаўся дызайнам, за што быў прэміяваны і ўганараваны. У сярэдзіне 60-х разам з жонкай Сімонай перабраўся на сталае жыццё ў ЗША, дзе і памёр. У 2005 годзе ў Брэсцкай абласной бібліятэцы адбылася першая і пакуль што адзіная персанальная выстава копіяў твораў мастака.

**Пулхаў Яўген Пятровіч** (1908–1992). З сям’і чыгуначніка, нарадзіўся ў Баранавічах, бацькі пераехалі ў Пінск на пачатку 20-х г. Скончыў рэальную вучэльню, працаваў землямерам. Фёдар Лаўроў быў яго першым настаўнікам малявання, які далучыў здольнага юнака да аздаблення Палескага кірмашу. Жывапісная спадчына Я. Пулхава таго часу сціплая — некалькі эцюдаў алеем пінскіх цэркваў ды каплічак. Пазнейшыя творы мастака захаваліся няблага. Ладная калекцыя іх захоўваецца ў Пінскім краязнаўчым музеі. Улюблёная тэма яго акварэляў — нацюрморты з кветкамі. Да 30-х угодкаў перамогі над Германіяй выканаў цыкл гравюраў. Шмат працаваў у галіне дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва, займаўся роспісам керамікі і драўляных талерак. Прыкметны след Пулхаў пакінуў як мастак-педагог. Па вайне працаваў метадыстам у Доме народнай творчасці. Адшукваў на Палессі майстроў інсітнага мастацтва. З 1953 года кіраваў студыяй. Вучнямі яго былі Хургель, Байрачны, Шатохін, Шэер, Вярэніч, Глушко і інш.

***

Акрамя Віленскай школы мастакоў і пінскай мастацкай арцелі ёсць факты, якія сведчаць пра існаванне ў Заходняй Беларусі і іншых мастацкіх асяродкаў. Трэба шукаць. Бо апрача ўласна мастацкіх вартасцяў, гэта спадчына мае ўжо неацэнную дакументальную і гісторыка-культурную значнасць. Бо вяртанне гэтай спадчыны дапаможа нам нарэшце ўсвядоміць, як стала прырастаць да твару беларуса накінутая маска расійска-савецкай культуры, прыпарошаная стандартнымі элементамі «мясцовага каларыту», якіх рысаў адметнага нацыянальнага твару мы пазбавіліся за 70 год «*торжества соцреализма*». А значыць, мы зможам лепш зразумець, як нам ад гэтай маскі пазбавіцца, вярнуцца да сябе.

ЮБІЛЕЙ

# ГІСТОРЫК АД БОГА

Эла ДЗВІНСКАЯ

**Каб рашуча змяніць прафесію, а з гэтым і свой лёс, трэба сапраўды пачуць у душы пакліканне. Моцнае і неадольнае. Што калісьці і здарылася з маладым урачом Анатолем Грыцкевічам.**

Ён атрымаў другую вышэйшую адукацыю, закончыў аспірантуру і з таго часу даследуе, выкладае ў ВНУ, прапагандуе гісторыю Беларусі. Піша грунтоўныя манаграфіі і папулярныя кнігі, нарысы і артыкулы. Жыве гісторыяй. Вяртае сапраўдную гісторыю Беларусі ў грамадскі ўжытак. Ніводнай прахадной тэмы, ніводнага кан’юнктурнага радка. Ад першых крокаў на попрышчы гістарычнай навукі да дня сённяшняга.

Выбітны вучоны і грамадскі дзеяч новай хвалі беларускага адраджэнскага руху 1990-х гадоў. Прафесар, акадэмік Міжнароднай Акадэміі Еўразіі, удзельнік шэрагу міжнародных навуковых канферэнцый — у Польшчы, Літве, Украіне, Славакіі, Англіі, Германіі. Лаўрэат прэміі часопіса *Przegled Wschodni* імя Аляксандра Гейштэра 2008 года, што ўручаецца навукоўцам за пашырэнне ведаў пра гісторыю Усходняй Еўропы.

Сваё 80-годдзе прафесар Грыцкевіч адзначае выхадам дзвюх новых прац.

Мы папрасілі Анатоля Пятровіча распавесці пра іх колькі слоў.

— Зусім нядаўна я падрыхтаваў да выдання дзве кнігі. Першая з іх — «Заходні Фронт РСФСР у 1918–20 гады». Друкуецца яна на рускай мове, што з рэдактарам і выдаўцом мы зрабілі свядома, каб з кнігай маглі азнаёміцца і рускамоўныя чытачы. Бо ўпершыню гаворка ідзе пра расійска-польскую вайну, якая падавалася ў савецкай гістарыяграфіі як грамадзянская. Гэта грунтоўнае выданне, з мапамі і схемамі, адлюстроўвае барацьбу Расіі і Польшчы за Беларусь. Паказана, як Расія гуляла з беларускай тэрыторыяй. Цэлы год я жыў у тых часах, вяртаўся думкамі ў тую эпоху. Кніга выходзіць у выдавецтве «Гарвест», філіяле Маскоўскага выдавецтва АСТ.

Другая кніга падрыхтавана Згуртаваннем беларусаў свету «Бацькаўшчына». Гэта зборнік артыкулаў і нарысаў, надрукаваных у газетах «Наша слова», «Народная воля» пад назвай «Старонкі нашай мінуўшчыны». Большасць з іх прысвечана выбітным гістарычным асобам, князям Вялікага княства Літоўскага. Ёсць таксама артыкулы пра Слуцкі збройны чын, пра паход Булак-Балаховіча і іншыя.



▸ ВЫСТАВЫ

# «ПУЛЬС ПЛАНЕТЫ» АЛЯКСАНДРА КІШЧАНКІ

Аляксей ХАДЫКА

**На выставе Аляксандра Міхайлавіча Кішчанкі (1933–1987) «Пульс планеты» ў Нацыянальным мастацкім музеі ўражвае ўсё: маштаб і колькасць прац (больш за 150), якасць магутнага пісьма і строга дакладнага малюнка, нястрыманасць жывапіснага тэмпераменту і свабода творчай фантазіі.**



Новае адкрыццё мастака пасля дзесяцігадовага перапынку, што наступіў пасля нечаканай і заўчаснай смерці «беларускага Сікейраса». Аднак чаму «Сікейраса»? Вядома, што так з павагай называлі вядучага мастака-манументаліста Беларусі 1970–90-х гадоў яго сябры. І не выпадкова: яго мазаічныя кампазіцыі «Беларусь партызанская» (1973), чатыры на тэму «Горад» на будынках жылых дамоў у мікраараёне Усход–1, насычаныя рэмінісцэнцыямі творчасці вялікага мексіканца, вядомыя ўсім у Беларусі.

Але калі прыходзіш на выставу, разумееш, што Кішчанка прапусціў праз свае пачуцці і пераўвасобіў у сваёй творчасці нашмат шырэйшыя пласты мастацкай культуры ХХ стагоддзя. Найперш еўрапейскага постімпрэсіянізму і расійскага авангарду. Лепшых «фармалістаў» і каларыстаў мінулага стагоддзя. І прыехаў у Беларусь у 1963 годзе выкладаць на аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва Тэатральна-мастацкага інстытута (дзе выкладаў у 1963–1970) ужо спелым сфармаваным жывапісцам.

А выхаванне атрымаў у Львоўскім інстытуце прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва. Працаваў і ў Кіеве — і тут нялішне прыгадаць, што менавіта мастакі рэпрэсаванай у 1930-я гады украінскай «харкаўскай школы», такія, як Васіль Ярмілаў, дажылі за ўсіх у Савецкім Саюзе захоўвалі дух расійскага авангарду. Ці не адсюль пераемнасць? Поўныя выразу і энергіі фарбы і формы, непаўторны аўтарскі стыль. Пачынаючы ад прац канца 1950-х у творах майстра можна пазнаць «перагукі» з палотнамі Наталлі Ганчаровай і Казіміра Малевіча, Арыстарха Лентулава і Пятра Канчалоўскага, Васіля Кандзінскага і Мартыроса Сар'яна.



Колер і форма, плюс нястрымаMная энергія. Паветра і прадметы, якія не ўвасабляюцца аптычна, але ажываюць праз выпрамяненне фарбаў. Але сапраўднае мастацтва, як і літаратура, вырастае на глебе ўспрыняцця папярэдняй культурнай традыцыі. Таму, пералічаўшы імёны славутых жывапісцаў, чый вобразны свет прыпамінаецца на выставе Кішчанкі, заўважым наступнае. У яго працах няма непасрэднай цытатаў «з класікаў». Яго творы стаяць на фундаменце дасягненняў папярэднікаў як на пастаменце. І вызначаюцца сваім адметным стылем, распрацаваным і ўдасканаленым дзесяцігоддзямі працы.

Той, хто прызвычаіўся ўспрымаць Кішчанку як запіснога манументаліста, здзівіцца пяшчотным і высакародным жаночым партрэтам — ад лірычнай «Ніны» (вобраз жонкі, мастачкі Н. Кухарэнка), да ўзнёслага вобраза творцы ў «Партрэце Алены Абразцовай». З апошняй Кішчанка сябраваў, як сябраваў і ліставаўся з такімі знакамітасцямі, як Рэната Гутуза. А творы яго трапілі не толькі ў буйнейшыя музеі, як Траццякоўка, але і ў калекцыі прэзідэнтаў — Біла Клінтана, Франсуа Мітэрана.

Апошняе цалкам заканамерна: талент мастака меў маштаб, які выводзіў яго на падмосткі сусветнага культурнага і грамадскага жыцця. Таму з'яўленне яго габелена «Чарнобыль» у штаб-кватэры Арганізацыі Аб'яднаных Нацый (ЗША, Нью-Йорк) у 1991 годзе нельга лічыць вынікам палітычнай кан'юнктуры. Мастак даспеў да права звяртацца ад імя Беларусі да ўсяго свету. А на той час больш балючай тэмы за Чарнобыль хіба і не было. Варта заўважыць, што менавіта Кішчанка стаў і ля вытокаў адраджэння слаўнай традыцыі беларускага габелена, невыпадкова яго імя носіць Барысаўскі камбінат ужытковага мастацтва. Цягам 5 год больш дзесятка майстрых увасаблялі там самы знакаміты твор Аляксандра Кішчанкі — «Габелен стагоддзя», палатно вышынёй у шасціпавярховы дом, выробленае метадам ручнога ткацтва з воўны. Памер скончанага ў 1995 годзеі занесенага ў Кнігу рэкордаў Гінеса габелена 19х14 метраў, або 266 квадратных метраў, вага 286 кілаграмаў. На габелене вывы сямідзесяці найбольш выдатных дзеячаў ХХ стагоддзя — Коля, Мітэрана, Клінтана, Валенсы, Буша, Сталіна, Чэрчыля, Леніна, Гарбачова і іншых. У самым версе справа, узвышаючыся над усімі іншымі, выяўлены цяперашні прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. Але на галоўным і больш пачэсным месцы паводле мастацкай і геральдычнай традыцыі, злева наверсе, — аўтапартрэт мастака. Памятаеце папулярны жарт 1970-х пра запіс у энцыклапедыі: «Брэжнеў — дробны палітычны дзеяч эпохі Алы Пугачовай»?

Таму зноў-такі не будзем казаць пра кан'юнктуру ў дачыненні да таго, што для мастака — толькі адзнакі часу і элементы сімвалічнага ўвасаблення. І нагода для роздуму пра адвечнае змаганне дабра і зла, чаму і прысвечаны габелен. Лепш наведаем выставу, пакуль ёсць магчымасць непасрэдна адчуць прыцягальную выразнасць сапраўды выдатных прац. А таксама задумаемся пра лёс некаторых з іх: 6 габеленаў майстра з фае Нацыянальнага акадэмічнага тэатра оперы і балета («Беларусь», «Музыка», «Скарына», «Песняры», «Рэвалюцыя» і «Космас») не вернуцца на месца пасля рэканструкцыі будынка. Тры габелены перададзены ў студэнцкі тэатр Акадэміі мастацтваў. Лёс яшчэ трох — нявызначаны. Новы час — новыя тэмы? Ці мы залішне багатыя, каб настолькі вольна распараджацца мастацкай спадчынай сваёй краіны? Выстава Аляксандра Кішчанкі працуе па 24 лютага.

## АФІША

### 13 лютага клуб «Рэактар»

**Metallection прадстаўляе фэст «Пятніца 13» з удзелам гуртоў: «Asguard», «Nightside Glance», «Weeping Twilight», «Soulsides», «The Dim Sun» і інш.**

Пачатак 18.00.

Квіткі ад 18000 да 25000. Даведкі па тэл. (+37529) 649 08 88.

### 14 лютага вялікая зала к/з Мінск

**Прэзентацыя новага альбома «Дрыгула (Полацкі сшытак)» гурта «СТАРЫ ОЛЬСА».**

Пачатак у 19.00.

Квіткі ад 15000 да 35000. Даведкі па тэл. (+37529) 649 08 88.

### 15 лютага Палац Прафсаюзаў

**Канцэрт барда і акцёра Віктара Шалкевіча.**

Пачатак у 19.00.

Квіткі ад 15 000 да 25 000. Даведкі па тэл. (+37529) 649 08 88.

### 20 лютага клуб «Рэактар»

**Штогадовы фэст-трыб'ют NIRVANA, прысвечаны дню народзінаў Курта Кабэйна. Удзельнічаюць гурты «Zaniapad», «Мутнае Вока», «Голая Манашка», «Determine», «In Joy», «LikBez», «Псіхоз».**

Пачатак у 17.30.

Квіткі ад 18000 да 25000. Даведкі па тэл. (+375 29) 649 08 88.

# «ЧУНЬЦЗЭ»

**Чарговая ўдалая экспазіцыя мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» — сумесная выстава твораў маладых мастакоў Кітая і Беларусі, прысвечаная кітайскаму Новаму году — святу вясны «Чуньцзэ». Яна дэманструецца ў Палацы Рэспублікі з 23 студзеня па 7 лютага.**

Лішні раз можна пераканацца, што Кітай — вялікая краіна не толькі дзякуючы сваёй даўняй гісторыі, традыцыям і насельніцтву ў мільярд дзвесце мільёнаў жыхароў. Калі беларускія мастакія вучэльні прапануюць габелены, графіку і жывапіс навучэнцаў дзвюх установаў — Універсітэта культуры і мастацтваў і Акадэміі мастацтваў, то іх кітайскія сябры — адразу 10 мастацкіх акадэмій КНР.

Апошнія прывезлі ў Беларусь лепшыя дыпломныя працы сваіх навучэнцаў апошніх год. Самае адметнае ў тым, што побач з некаторымі творамі ў чыста кітайскай стылістыцы (Ван Цінцін, «Кветкі ў цяпліцы»), кітайскі бок падабраў мастацкія работы, якія дэманструюць выдатнае засваенне маладымі мастакамі краіны еўрапейскага жывапіснага кантэксту. Кітай інтэгруецца ў свет не толькі эканамічна, пра што згаданая выстава сведчыць з усёй пераканаўчасцю.

Цешыць, што беларуская моладзь выглядае на фоне азіяцкіх калег вельмі прыстойна, сведчанне чаго адкрыццё чарговага маладога імя — Вольгі Мельнік («У каптане», «Яніс»). Дырэктар Музея сучаснага мастацтва Васіль Шаранговіч у свежавыдадзенай кнізе ўспамінаў «Ген жыцця» заўважыў, што сёння маладым значна лягчэй выставіцца, нават наладзіць персанальную экспазіцыю. У гэтым ёсць і станоўчыя, і адмоўныя бакі. Колькі часу таму на выставах прэзідэнцкіх стыпендыятаў галерэя адкрыла імя Дзяніса Чубукова, творы якога не згубіліся і на «дарослых» паказах. Пажадаем поспеху і новым экспанентам галерэі «Універсітэт культуры».

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91; www.novychas.org; novychas@gmail.com; chasnavinau@gmail.com;
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 30.01.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.